Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
15 чэрвеня 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 113 (28729)


ЯК ПРАЙШЛА «ПЕСНЯ ГОДА» Ў НАВАПОЛАЦКУ МС

ДОМ, ДЗЕ ЎСЁ АГУЛЬНАЕ МС


9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV праграма
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый МАЛАШКА, міністр аховы здароўя:**

*«Пры ўсёй значнасці развіцця спецыялізаванай і высокатэхналагічнай дапамогі цэнтральнай фігурай у ахове здароўя застаецца ўрач першаснага звяна. Прэзідэнтам нашай краіны падтрымана стратэгія пераводу першаснага звяна ў агульнаўрачэбную практыку. Мы сёлета закупім неабходнае абсталяванне, забяспечым усе зноў арганізаваныя працоўныя месцы ўрачоў агульнай практыкі».*

## КОРАТКА

- Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 237 «Аб распараджэнні дзяржаўным жыллёвым фондам». Дакумент спрашчае парадак продажу незапатрабаванага на працягу шасці і больш месяцаў дзяржаўнага жылля ў сельскай мясцовасці.
- **У Брэсце 17 чэрвеня адбудзецца «Бацькаўскі фэст 2018», прысвечаны Міжнароднаму дню бацькі. Сямейнае свята ў абласным цэнтры пройдзе дзявяты раз.**



- Тыдзень устойлівай энергетыкі — 2018 пройдзе ў Браславе 18—23 чэрвеня, яго мэта — прыцягнуць увагу людзей да тэм клімату, аднаўляльнай энергетыкі і энергазберажэння.
- **У Мінску абноўлены парк машын хуткай дапамогі, за апошнія амаль два з паловай гады закуплена 119 адзінак тэхнікі.**
- У Віцебску работнік Дэпартамента аховы выратаваў на пажары мужчыну.

# ДЗЕЦІ МАЛЮЮЦЬ ГІСТОРЫЮ



Вучні Навагрудскай дзіцячай школы мастацтваў, нягледзячы на летнія канікулы, працягваюць вучыцца малюнку і кампазіцыі з натуры на адкрытым паветры. Сёлета, у Год малой радзімы, яны малююць памятныя мясціны, звязаныя з іменем іх слыннага земляка Адама Міцкевіча, каб у верасні наладзіць выстаўку найлепшых работ у музеі паэта. Дарэчы, сёлета Адаму Міцкевічу споўніцца 220 гадоў. Вучыць юных мастакоў настаўніца мастацкіх дысцыплін Святлана БАЯРОЎСКАЯ.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

■ Разумныя грошы

## «Крызіс» другога паручыцеля




**Правілы гульні ў крэдыты змяніў Нацыянальны банк краіны. Прайшло паўтара месяца. І папаўзлі чуткі, што ўзяць салідны крэдыт на нерухомасць стала праблематычна. Не ўсім, а ў асноўным тым, у каго заробкі сярэднія. З'явілася асцярога, што крэдыты на жыллё будуць пацІху згортвацца або даражэць. Мы вырашылі разабрацца, што змянілася ў гэтай сферы, і паспрабавалі зразумець, які крэдыт нам па кішэні.**

СТАР. 2

■ 50+: жыць цікава!

## «УСЯГО ТОЛЬКІ ТРЭБА БЫЛО РАЗЗЛАВАЦЦА НА СЯБЕ!»

### Як наш герой скінуў 20 кг і прывёў сябе ў форму

**Людзі не пачынаюць менш рухацца, калі старэюць, яны старэюць, калі пачынаюць менш рухацца, — жыццёвы дэвіз 70-гадовага Міхаіла Заржыцкага. Хоць сухія лічбы ўзросту даволі складана суаднесці з бадзёрым, энергічным, падцягнутым Міхаілам Рыгоравічам. Гэты дзіўны мужчына разбівае многія стэрэатыпы. Ён не толькі трэніруецца чатыры разы на тыдзень і праязджае на веласіпедзе па 60 кіламетраў у дзень. У яго, былога марака, падводніка і будаўніка, раз за разам з'яўляюцца новыя захапленні. Напрыклад, пару гадоў таму ён заняўся выпечкай тартоў. Пагадзіцеся, нячаста сустрэнеш такое хобі сярод 70-гадовых беларускіх мужчын...**

**Лішняя вага, канькі ў 59 гадоў, настольны тэніс**

Вы, напэўна, адразу выкажаце здагадку, што нашаму герою пашанцавала мець жалезнае здароўе. А вось і не, над сваім здароўем ён сам працуе, прычым штодня. У Міхаіла Заржыцкага, між іншым, ужо гадоў дзесяць як другая група інваліднасці. Але ён і не думае здавацца хваробам. Чатыры разы на тыдзень наш герой займаецца ў Рэспубліканскім рэабілітацыйным цэнтры Беларускага таварыства інвалідаў. Ехаць туды далёка, праз паўгорада. «Затое без перасадкі, — усміхаецца Міхаіл Рыгоравіч. — У мяне праблемы з каардынацыяй, дактары мне парэкамендавалі настольны тэніс. І я ў яго там гуляю. У нас галоўны трэнер — чэмпіён Еўропы па настольным тэнісе сярод калясачнікаў».

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X
18113

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ
Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе
Заставайцеся з намі — будзе цікава!

■ Парламенцкі дзённік

# Актывізацыя крок за крокам

Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Баляслаў Пірштук сустрэўся з дзяржаўным сакратаром Міністэрства замежных спраў Румыніі Дэнуцам Себасціянам Некулэеску. У наступным годзе Румынія стане дзяржавай — старшынёй Савета Еўрасаюза. І дзяржсакратар запэўніў, што ў гэты час краіна будзе ўдзяляць вялікую ўвагу супрацоўніцтву з усходнімі партнёрамі.

На думку Баляслава Пірштука, патэнцыял ва ўзаемадзеянні вялікі. Добрыя адносіны з калегамі з румынскага парламента складваюцца і падчас працы на міжнародных пляцоўках. Баляслаў Пірштук нагадаў, што Беларусь рыхтуе рэзалюцыю па лічбавай эканоміцы да чарговай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Берліне. А таксама ўдакладніў, што канферэнцыю Групы падтрымкі Шаўковага шляху, у якую ўваходзяць абедзве краіны, плануецца правесці ў маі наступнага года ў Мінску.

Тым не менш, на думку парламентарыя, тавараабарот у $150 млн — гэта крыху сціпла для нашых магчымасцяў. Можна было б паставіць перад сабой задачу яго падвоіць, тым больш што ЕАЭС стварае добрую пляцоўку для прасоўвання бізнесу.

**Надзея АНІСОВІЧ**

# Напярэдадні галоўнага старту

## Сёлета Беларусь прыме чэмпіянат свету па баскетболе сярод дзяўчат да 17 гадоў

Сёння ў сталічным Палацы спорту стартуе міжнародны турнір па баскетболе памяці заслужанага трэнера СССР Сямёна Халіпскага. З 15 да 17 чэрвеня зборная Беларусі (дзяўчаты U-17) сустрэнецца з саперніцамі з Чэхіі, Эстоніі і Кітая. З 21 да 29 ліпеня наша краіна таксама прыме чэмпіянат свету па баскетболе сярод дзяўчат да 17 гадоў.

Традыцыйна міжнародны турнір памяці Сямёна Халіпскага праводзіўся сярод нацыянальных камандаў, але сёлета спаборніцтвы праходзяць сярод юніёрак, якія змогуць такім чынам лепш падрыхтавацца да чэмпіянату свету. Чакаецца, што беларускам будуць супрацьстаяць моцныя саперніцы, што будзе добра для каманды.

Як адзначыў **старшыня Беларускай федэрацыі баскетбола Максім РЫЖАНКОЎ**, вырашаны практычна ўсе пытанні, звязаныя з харчаваннем, размяшчэннем камандаў, суддзяў, афіцыйных прадстаўнікоў FIBA і гледачоў. «Цяпер адпрацоўваюцца апошнія нюансы, звязаныя з правядзеннем такога прадстаўнічага форуму», — заявіў кіраўнік БФБ. Акрамя таго, паводле яго слоў, турнір памяці Сямёна Халіпскага ў Мінску стане тэстам перад чэмпіянатам свету: гэта магчымасць на практыцы адпрацаваць усе тэхнічныя, транспартныя, медыцынскія і іншыя элементы.

Пасля мінскага турніру беларуская каманда пад кіраўніцтвам Вікторыі Дацун адправіцца на спаборніцтвы ў Францыю, пасля чаго правядзе некалькі кантрольных сустрэч з аднагодкамі з Літвы і Латвіі, а непасрэдна перад пачаткам чэмпіянату свету намечаны спарынг са зборнай Новай Зеландыі. На сусветным першынстве нашы дзяўчаты выступяць у групе А. Іх саперніцамі стануць каманды Францыі, Японіі і Калумбіі.

Учора таксама быў прэзентаваны афіцыйны талісман чэмпіянату свету па баскетболе (U-17) — бусляня.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# «Крызіс» другога паручыцеля

## На агульных падставах пад 13,5 % гадавых

Узялі мы за аснову крэдыт на будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў і кватэр і на набыццё жылля. Крэдыт Беларусбанка, напрыклад. Ён выдаецца на агульных падставах і якіх-небудзь ільгот не прадугледжвае.

Крэдыт гэты выдаецца на тэрмін да 20 гадоў з магчымасцю датэрміновага пагашэння яго без збірання штрафных санкцый. Працэнты плацяцца толькі за фактычны час карыстання крэдытам. Працэнтная стаўка роўная стаўцы рэфінансавання плюс тры працэнтныя пункты (10,5 + 3).

Афармленне крэдыту грамадзянам, якія атрымліваюць заробтную плату (пенсію) ва ўстановах банка, магчыма без падачы даведкі аб даходах. Аб'ём крэдыту можа даходзіць да 90 % кошту будаўніцтва жылога памяшкання ў межах плацежаздольнасці крэдытаатрымальніка.

Па крэдыце ў памеры, які не перавышае 100 тысяч рублёў, прадугледжаны спосаб забеспячэння выканання абавязацельстваў. Гэта паручальніцтва, залог і іншыя спосабы, прадугледжаныя заканадаўствам, акрамя няўстойкі і страхавання рызыкі незвароту крэдыту. Па крэдыце ў памеры звыш 100 тысяч рублёў: паручыцельства і залог (іпатэка) кватэры.

Пагашэнне асноўнага доўгу па крэдыце ажыццяўляецца па наступным алгарытме. Пры будаўніцтве жылых памяшканняў у шматкватэрных жылых дамах — з наступнага месяца пасля заканчэння 18 месяцаў, якія ідуць за месяцам прыёмкі ў эксплуатацыю законченага будаўніцтвам аб'екта нерухомасці, але не пазней чым праз тры гады пасля заключэння крэдытнага дагавора. Працэнтная стаўка за карыстанне крэдытам плавае і пераўтвараецца з дня змянення стаўкі рэфінансавання Нацбанка краіны.

## Паперак шмат не бывае

Для пачатку трэба разабрацца, якія патрабуюцца дакументы. Гэта копія пашпарта крэдытаатрымальніка і паручыцеля з прад'яўленнем арыгінала. Даведкі аб даходах грамадзян для атрымання крэдыту і афармлення паручыцельства. Калі заяўнік і паручыцель атрымліваюць заробтную плату або пенсію ва ўстанове банка, то можна і выпіску з рахунку за тры апошнія месяцы.

Таксама неабходна згода крэдытаатрымальніка і паручыцеля на падачу крэдытнай справаздачы з крэдытнага рэгістра рэгулятара. Згода на падачу крэдытнай справаздачы можа быць афармлена заяўнікам непасрэдна ў Нацыянальным банку. У гэтым выпадку крэдытная справаздача з крэдытнага рэгістра падаецца заяўнікам у банк самастойна.

Варта ведаць: тэрмін дзеяння даведак (аб даходах) — 30 каляндарных дзён пасля іх выдачы. Датай выдачы лічыцца паказаная на даведцы дата рэгістрацыі прадпрыемства (арганізацыі), якая выдала такую даведку.

## Даход толькі крэдытаатрымальніка і яго жонкі

Пры разліку памеру крэдыту пры недастатковай плацежаздольнасці кліента па рашэнні крэдытнага камітэта ў яго сукупны даход могуць уключацца даходы паручыцеляў — блізкіх сваякоў (членаў сям'і) крэдытаатрымальніка (жонкі, бацькоў, родных братоў (сясцёр), дзяцей, унукаў). Гэта цалкам нармальная практыка. Крэдыт на жыллё потым дапамагае адразу ўся вялікая сям'я.

Дык вось. Да нас дайшла інфармацыя, што гэты пункт у Беларусбанку злёгку падкарэктавалі.

Ваш рэпарцёр спецыяльна звязаўся з анлайн-кансультантам банка. Яго гісторыя была простая. «У мяне заробак 500 у. а. Жонка не працуе. Але ёсць багатыя сябры, якія гатовыя стаць паручыцелямі. Які крэдыт дадуць у гэтым выпадку пад заклад жылля?»

На што быў дадзены цалкам лаканічны адказ:

— ... Папярэднія разлікі вы можаце зрабіць самастойна з дапамогай «крэдытнага калькулятара». Дакладныя разлікі вам выканаюць толькі ў банку на падставе поўнага пакета дакументаў. Максімальная сума крэдыту разлічваецца ў межах крэдытаздольнасці крэдытаатрымальніка, але не павінна перавышаць 90 % ад кошту будаўніцтва ...

— Так, пры разліку памеру крэдыту пры недастатковай плацежаздольнасці крэдытаатрымальніка па рашэнні крэдытнага камітэта ў яго сукупны даход могуць уключацца даходы паручыцеляў — блізкіх сваякоў ...

**— (І ўвага!) Пры гэтым па заявах (пакетах дакументаў), прынятых з 28 мая да 30 чэрвеня (уключна), у сукупны даход заяўніка можа быць уключаны даходы не больш за аднаго паручыцеля. У першачарговым парадку разглядаецца пытанне аб прадастаўленні ў забеспячэнне крэдыту паручыцельства жонкі заяўніка.** На жаль, ваша жонка не працуе...

**— Паручыцель можа быць толькі адзін?**

—Як правіла, прадугледжана не менш за два паручыцелі.

**— Час разгляду заяўкі на крэдыт?**

— Рашэнне прымаецца — не пазней трох рабочых дзён (пры прыняцці ў забеспячэнне залогу маёмасці — не пазней за 10 рабочых дзён) пасля рэгістрацыі заявы-анкеты заяўніка.

Як далі мне зразумець кансультанты банка, з майго заробку я магу атрымаць крэдыт, якога хопіць на фінансаванне будаўніцтва невялікага пакоя, але ніяк не кватэры ...

## Стаўка большая, але крэдыт можа і атрымаю

Белінвестбанк выдае крэдыты на будаўніцтва жылой нерухомасці і на набыццё жылля. Выдаюцца грошы на гэтыя тэмы на два тэрміны: на 10 і на 20 гадоў. Умовы абсалютна аднолькавыя. Безнаяўнае пералічэнне грашовых сродкаў на рахунак забудоўшчыка або на рахунак прадаўца. Ад прадастаўлення крэдыту: разавая выдача, неаднаўляльная крэдытная лінія.

Памер працэнтнай стаўкі роўны 1,3 стаўкі авернайт,* што роўна 15,28 % гадавых. Памер працэнтнай стаўкі паказваецца ў крэдытным дагаворы ў выглядзе зменнай плаваючай працэнтнай стаўкі, якая залежыць ад стаўкі авернайт. Пры гэтым, працэнтная стаўка не можа быць ніжэйшай за яе абсалютнае значэнне, разлічанае на дату заключэння крэдытнага дагавора.

Працэнты ўжо не на мінімуме, але затое прыцягвае крэдыт цалкам ліберальнымі ўмовамі. Гэта: базавы спосаб забеспячэння — паручыцельства фізічнай асобы або юрыдычнай асобы; максімальная сума крэдыту — разлічваецца зыходзячы з крэдытаздольнасці заяўніка і плацежаздольнасці паручыцеля. Вось яно. Прыводзь хоць дзесяць паручыцеляў, усіх іх у цябе прымуць. Ці не ўсіх?

## Амаль што іпатэка

На пытанне, што такое беларуская іпатэка, паспрабуем адказаць на прыкладзе крэдыту «Хутка наваселле» ад Белгазпрамбанка. Гэта ў заходніх краінах іпатэка мае на ўвазе зусім невялікія працэнты, у нас усё крыху па-іншаму ...

Па крэдыце «Хутка наваселле» грошы цяпер выдаюцца пад 16,45 % гадавых. Дарэчы, працэнт тут таксама не фіксаваны — стаўка рэфінансавання павялічаная на 5,95 п. п.

Крэдыты выдаюцца на фінансаванне набыцця і будаўніцтва кватэр у шматкватэрных дамах, а таксама рэфінансаванне раней атрыманых крэдытаў у іншых банках на набыццё і будаўніцтва кватэр. Перавага іпатэчнага крэдытавання ў Белгазпрамбанку — індывідуальны падыход, мінімальны пакет дакументаў і спрошчаны парадак атрымання крэдыту. Так, ва ўсякім выпадку, яны самі пра сябе заяўляюць.

Максімальная сума: не больш за 80 % ад рынкавага кошту закладной маёмасці, тэрмін выдачы крэдыту 20 гадоў, а спосабы забеспячэння — заклад кватэры і (або) паручыцельства фізічных асоб.

Кліент для атрымання крэдыту павінен знаходзіцца ва ўзросце ад 18 да 64 гадоў, быць рэзідэнтам альбо мець від на жыхарства ў Беларусі, афіцыйна працаваць на апошнім месцы працаўладкавання на працягу мінімум трох апошніх месяцаў альбо ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць не менш за шэсць месяцаў.

Для атрымання крэдыту неабходна падаць даведку, копіі старонак 31—33 пашпарта, дагавор куплі-продажу кватэры або арыгінал дагавора на ўдзел у долевым будаўніцтве. Быццам бы ўсё. Калі б яшчэ працэнты меншыя...

Дарэчы, пры выбары забеспячэння крэдыту, работнікі банка настойліва рэкамендуюць усім сваім кліентам менавіта заклад кватэры. Так, на ўсялякі выпадак.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*Стаўка авернайт — стаўка па аднадзённым разліковым крэдыце, устаноўленая Нацыянальным банкам (11,75 %)*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ПАМЁР СТАНІСЛАЎ ГАВАРУХІН



Ва ўзросце 82 гадоў памёр рэжысёр, акцёр і дэпутат Дзяржўнай думы Станіслаў Гаварухін. Пра гэта паведаміў спікер Дзяржднай Вячаслаў Валодзін на пленарным пасяджэнні. Гаварухін памёр ад працяглай хваробы ў санаторыі «Барвіха». «Ён змагаўся да канца з хваробай, але яна яго перамагла», — заўважыў Валодзін. Дэпутаты ўшанавалі памяць кінематаграфіста хвілінай маўчання. Станіслаў Гаварухін найбольш вядомы па шматсерыйным фільме «Месца сустрэчы змяніць нельга». Ён таксама зняў такія стужкі, як «Канец выдатнай эпохі», «Вертыкаль», «Дзесяць негрыцянят», «У пошуках капітана Гранта» і «Варашылаўскі стралок». У 2006-м кінематаграфіст атрымаў званне народнага артыста Расіі. Бывайце, Станіслаў Сяргеевіч...

## ПРЭЗІДЭНТ МАКЕДОНІІ АДМОВІЎСЯ ПАДПІСВАЦЬ ДАМОВУ АБ ПЕРАЙМЕНАВАННІ КРАІНЫ

Прэзідэнт Македоніі Георге Іванаў адмовіўся падпісаць дамову з Грэцыяй аб перайменаванні краіны, паведамляе NovaTV. «Мая пазіцыя канчатковая, і я не буду паддавацца ніякаму ціску, шантажу або пагрозам. Я не буду падтрымліваць або падпісваць такое пагадненне, якое наносіць шкоду», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Як падкрэсліў Іванаў, дамоўленасць супярэчыць канстытуцыі краіны. Пагадненне не аб'ядноўвае грамадства, а дадаткова ўносіць у яго раскол, адзначыў ён. «Я не буду легалізаваць палітычную самадзейнасць», — заявіў у звароце да нацыі кіраўнік дзяржавы, словы якога прыводзіць РІА «Навіны».

## МЯДЗВЕДЗЕЎ АБВЯСЦІЎ АБ ПАВЫШЭННІ ПЕНСІЁННАГА ЎЗРОСТУ

Прэм'ер-міністр Расіі Дзмітрый Мядзведзеў абвясціў аб павышэнні пенсіённага ўзросту з 2019 года. Пра гэта кіраўнік урада заявіў у ходзе пасяджэння кабінета міністраў, паведамляе ТАСС. Ён адзначыў, што ўлады маюць намер павышаць узрост выхаду на пенсію паступова. Для мужчын гэты паказчык будзе падняты да 65 гадоў, а для жанчын — да 63. «Прапануецца ўвесці досыць працяглы пераходны перыяд — пачаць яго прапануецца з 2019 года, каб пакрокава дасягнуць выхаду на пенсію ў 65 гадоў для мужчын у 2028 годзе і ў 63 гады для жанчын у 2034-м», — сказаў прэм'ер-міністр.

## УРАД ГРУЗІІ СЫШОЎ У АДСТАЎКУ

Прэм'ер-міністр Грузіі Георгій Квірыкашвілі абвясціў аб сваёй адстаўцы. У адстаўку таксама сыходзіць урад краіны. Сваю пасаду Квірыкашвілі займаў са снежня 2015 года. РІА «Навіны» адзначае, што адстаўка адбылася на фоне масавых акцый пратэсту з патрабаваннем «аднаўлення справядлівасці» ў справе аб забойстве 16-гадовых школьнікаў. Арганізатарам пратэстаў з'яўляецца Заза Саралідзэ — бацька аднаго з забітых. Пратэстоўцам удалося дамагчыся адстаўкі галоўнага пракурора краіны Іраклія Шатадзэ, затым яны запатрабавалі адстаўкі кіраўнікоў Мінюста, МУС і ўрада ў цэлым.

# ПРЫХІЛЬНІКІ РОДНАГА СЛОВА

## У паўфінале «Жывой класікі» сабраліся найлепшыя чытальнікі

**Паўфінал конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка» гэтымі днямі прайшоў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Сёлета ён прысвечаны Году малой радзімы. Таму ўдзельнікі выбіралі адпаведныя творы, якія апяваюць хараство роднай зямлі.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

У журы ўвайшлі прадстаўнікі ўстаноў, што заснавалі конкурс, — Міністэрства інфармацыі, Міністэрства адукацыі, Саюза пісьменнікаў Беларусі, — а таксама іншыя творцы і грамадскія дзеячы. **Першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена СТЭЛЬМАХ** зазначыла:

— Старонкі кніг нібы ажылі, бо гучалі самыя лепшыя вершы, самыя адметныя выбраныя ўрыўкі з прозы. Ажылі таксама і героі — усе ўдзельнікі вельмі вобразна і маляўніча падышлі да стварэння сваіх вобразаў, каб перадаць сэнс выбраных твораў. Хочацца пажадаць, каб тыя хваляванні, з якімі юныя чытальнікі завіталі сюды, былі ўвасоблены ў добрыя вынікі рэспубліканскага конкурсу.

Чытальнікі ўсіх узростаў — і першакласнікі, і старэйшыя школьнікі па-свойму здзіўлялі майстэрствам чытання нашай класікі, сваёй яскравай эмацыянальнасцю, добра падабранымі вобразамі.

Члены журы звярталі ўвагу на тое, наколькі глыбока і пранікнёна чытальнік пагрузіўся ў твор, які быў ім абраны. Наколькі твор адпавядаў тэматыцы сёлетняга конкурсу — «Жывая класіка. Прысвячэнне малой радзіме». Вядома, члены журы мелі на ўвазе і той артыстызм, з якім выконваліся творы. Такім чынам, у кожнай узроставай катэгорыі былі абраны па тры пераможцы.





**Уладзіслаў ПРАКАПЕНКА з Мінска** чытаў верш Артура Вольскага «Дзедаў госць». Ён расказаў карэспандэнту «Звязды», як рыхтаваўся да конкурсу:

— Прачытаўшы гэты верш адзін раз, я вельмі добра сабе ўявіў усё, што ў ім адбываецца. Можна сказаць, што ён запаў мне ў душу, таму вырашыў яго прачытаць. Я ўявіў сабе, як дзейнічаюць героі, у якім памяшканні. Падобную хату, як у вершы, я бачу ў сваіх бабулі і дзядулі ў вёсцы Скрыбаўцы Шчучынскага раёна. Дзед з гэтага твора нагадаў мне ўласнага дзядулю. Увогуле я часта вучу на памяць і чытаю вершы. Мае любімыя паэты — Якуб Колас і Артур Вольскі. Я вельмі люблю беларускую літаратуру, бо яна напісана на нашай роднай мове... Калі я чытаю пра тое, дзе герой твора сумуе, то ў маёй душы таксама з'яўляецца сумны смайлік. А калі твор радасны — то і ў мяне ў душы радасны смайлік!

Фінал рэспубліканскага конкурсу «Жывая класіка» адбудзецца 2 верасня. Ён пройдзе ў межах Дня беларускага пісьменства, які сёлета будзе ладзіцца ў Іванаве.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

***Больш фота глядзіце на сайце zviazda.by***

## КІРАЎНІЦТВА АБЛАСЦЕЙ НА СУВЯЗІ

**Традыцыйна заўтра ва ўсіх рэгіёнах краіны пройдуць прамыя тэлефонныя лініі.**

**16 чэрвеня з 9.00 да 12.00 на сувязі будуць:**

старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль Васілевіч ЛІС, тэл. (80162213121);

намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН, тэл. (80212222222);

старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Андрэевіч ДВОРНІК, тэл. (80232331237);

першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК, тэл. (80152735644);

намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Андрэй Міхайлавіч КУНЦЭВІЧ, тэл. (80222501869);

намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Віктар Іванавіч СІРЭНКА, тэл. (80175004160);

першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ, тэл. (80172224444)

■ Аўто

# Кіроўца, звярні ўвагу!

## Больш за 90 % патрыманых аўтамабіляў у Беларусі маюць няспраўнасці

Найбольш частыя праблемы — у тармазной сістэме або блоку кіравання рухавіком. Выяўленнем дэфектаў займаліся спецыялісты сеткі «Бош Аўто Сэрвіс» падчас бясплатнай дыягностыкі машын у Мінску, Брэсце і Барысаве.

Кожны ахвотны мог прывезці на праверку любы легкавы аўтамабіль, незалежна ад маркі, года выпуску і бягучага стану — у выніку ў мерапрыемстве прыняло ўдзел больш за тысячу машын.

Вынікі сапраўды здзіўляюць: пераважная большасць аўтамабіляў у Беларусі ездзяць з рознага роду дэфектамі ў электронных блоках. «Карыстаюцца папулярнасцю» праблемы ў блоку кіравання рухавіком і тармазной сістэме, часта сустракаюцца актыўныя памылкі ў блоку ABS (антыблакіровачнай сістэмы) і цэнтральным блоку электронікі, на многіх аўтамабілях некарэктна працуе або зусім «маўчыць» сістэма кантролю, што павышае рызыку больш сур'ёзных пашкоджанняў.

Іншыя распаўсюджаныя памылкі: няспраўнасць датчыкаў ціску ў шынах, праблемы з фарамі блізкага святла, падушкай бяспекі, шпулькай запальвання і лямбда-зондам (датчыкам рэшткавага кіслароду ў выхлапных газах), часам сустракаецца перагрэў рухавіка.

Бясплатная дыягностыка доўжылася з 21 мая да 1 чэрвеня. Кожны будны дзень спецыялісты правяралі каля 100 аўтамабіляў, і толькі ў 5—10 з іх не былі выяўлены праблемы. У кожнай машыне ў сярэднім знаходзілі па 10 няспраўнасцяў.



Газета «Звязда» нагадвае, што аўтамабіль неабходна старанна даглядаць і не адкладваць праблемы ў машыне да апошняга моманту, а своечасова звяртацца ў аўтамайстэрні.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ**

■ Надвор'е

# Дажджы доўгачаканыя, але кароткачасовыя

### А ў панядзелак ізноў прыгрэе да 27—29

**Над Заходняй Украінай ідзе фарміраванне магутных дажджавых воблакаў, звязаных з франтальным падзелам. Паволі рухаючыся ў паўночна-ўсходнім напрамку, атмасферны фронт набліжаецца да тэрыторыі нашай краіны. Таму, пад яго ўплывам па паўднёва-ўсходняй частцы чакаем дажджы, месцамі з навальніцамі, перадаюць у Белгідрамеце.**

У суботу месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Вецер прагназуецца паўночна-ўсходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 10—17 цяпла, а ўдзень будзе ад плюс 18 да плюс 25 градусаў, па паўднёвым усходзе — да 20—27 цяпла. У нядзелю надвор'е будуць фарміраваць цёплыя няўстойлівыя паветраныя масы, якія паступаюць з Украіны. У асобных раёнах краіны пройдуць кароткія летнія дажджы, чакаюцца навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 11—17 цяпла, удзень — ад плюс 22 да плюс 28 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак накіраванасць паветраных патокаў зменіцца: яны стануць заходнімі, і надвор'е стане фарміраваць атмасферны фронт з Заходняй Еўропы. Уначы ў асобных раёнах па захадзе, днём — на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы складзе 12—19 цяпла. Удзень будзе ад плюс 20 да плюс 27 градусаў, па поўдні — да 29 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ**

# Свята пачалося!



rsport.ria.ru

### АМЕРЫКА АТРЫМАЛА ЧС

FIFA WORLD CUP RUSSIA 2018

Чэмпіянат свету па футболе ў 2026 годзе прымуць адразу тры краіны — ЗША, Канада і Мексіка. Такое рашэнне было прынята на кангрэсе ФІФА ў Маскве. Адзіным канкурэнтам пераможцам была заяўка Марока. Адзначаецца, што арганізатары турніру плануюць зарабіць на яго правядзенні 11 мільярдаў долараў.

### ПРЫБЫТАК

Ну, а прыбытак чэмпіянату свету ў Расіі чакаецца амаль у два разы больш сціплы — 6,1 мільярда долараў. На цяперашні момант гэта сума стане рэкорднай. Яна на 10 % вышэйшая, чым прагназавала ФІФА, і на 1,3 мільярда большая, чым зароблена за мінулы мундзіяль. Федэрацыя пашырыла супрацоўніцтва з кітайскімі кампаніямі — сёлета 7 з 20 спонсараў мундзіялю прадстаўляюць Паднябесную.

### ПЕРШАЯ АХВЯРА



Яшчэ не пачаўся чэмпіянат, як грымнуў гром у выглядзе адстаўкі галоўнага трэнера, прычым аднаго з сусветных грандаў. Галоўнага трэнера зборнай Іспаніі Хулена Лапетэгі звольнілі з-за перагавораў з мадрыдскім «Рэалам». Паводле інфармацыі іспанскіх СМІ, менавіта навіна пра тое, што ён узначаліць «каралеўскі» клуб пасля ЧС, стала прычынай канфлікту паміж спецыялістам і нацыянальнай федэрацыяй, хоць кантракт трэнера са зборнай быў разлічаны да лета 2020 года. На перыяд чэмпіянату свету новым галоўным стане спартыўны дырэктар нацыянальнай каманды, дарэчы, былы капітан таго ж «Рэала» Фернанда Ера.

### ХТО ВЕРЫЦЬ У РАСІЮ?

Прагнозы напярэдадні ЧС агучваюцца пастаянна, але акрамя кампетэнтных часта гучаць і даволі, як бы гэта сказаць, нечаканыя. Гэтым разам адзначыўся вядомы ньюсмейкер і прыхільнік сябе любімага, адыёзны нападаючы «Лос-Анджэлес Гэлаксі» Златан Ібрагімавіч. Словы футбаліста, які не патрапіў у заяўку зборнай Швецыі на чэмпіянат, прыводзіць «Матч ТВ»: «Чэмпіянат свету выйграюць расіяне. Чаму? Таму што я тут. Я тут, каб Расія перамагла».

А вось алімпійскі чэмпіён, былая першая ракетка свету расійскі тэнісіст Яўген Кафельнікаў наадварот, сказаў, што не верыць у выхад расіян з групы, і адзначыў, што «джэкпот прасцей выйграць 100-мільярдны, чым нашай зборнай чэмпіянат свету».

### У МАСКВУ НА БОЧЦЫ І З САБАКАМ



70-гадовы Губерт Вірт пераадолеў каля 2300 кіламетраў на 82-гадовым трактары з прычэпам, каб дабрацца да расійскай сталіцы на чэмпіянат свету.




Пенсіянер з нямецкага Форхгайма — фанат футбола. У Маскву ён прыехаў на трактары Lanz Bulldog 1936 года выпуску праз Польшчу і Беларусь. Да трактара прымацаваны дом на колах у выглядзе піўной бочкі (пераабсталяванай з мабільнай лазні), на якой напісана «Hallo Moskau!». Вірта суправаджае верны сабака Хекс. Мужчына рухаўся з хуткасцю каля 20 кіламетраў у гадзіну і праязджаў у суткі каля ста кіламетраў. На Кіеўскай шашы нямецкага турыста сустрэлі супрацоўнікі ДПС і суправадзілі яго да сталіцы.

### ГАЛАДОЎКА ДЗЕЛЯ ЧС

Вязні турмы ў аргенцінскім Пуэрта-Мадрыне абвясцілі галадоўку, каб дамагчыся дазволу глядзець матчы чэмпіянату свету. Зняволеныя запатрабавалі адраманціраваць тэлевізійны кабель, які не працаваў на працягу трох дзён. «Кабельнае тэлебачанне з'яўляецца незаменным правам кожнага чалавека, пазбаўленага волі. Мы прынялі рашэнне не прымаць ежу да таго часу, пакуль нам не вырашаць гэтую праблему», — гаворыцца ў лісце. Аднак, пакуль іх патрабаванні засталіся без увагі.

*Першы гол сёлетняга чэмпіянату атрымалася забіць гаспадарам. Гэта зрабіў учора ў матчы-адкрыцці Расія—Саудаўская Аравія паўабаронца Юрый Газінскі.*

**Іван КУПАРВАС.**

# «УСЯГО ТОЛЬКІ ТРЭБА БЫЛО РАЗЗЛАВАЦЦА НА СЯБЕ!»



Міхаіл ЗАРЖЫЦКІ — удзельнік кросу ў рамках дабрачыннай кампаніі #velcombegom

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Рух — гэта жыццё, — пераканаены ён. — Я так не магу, як большасць пажылых людзей у нашым двары: яны выходзяць і сядзяць цэлы дзень на лавачках. Або пад краму ідуць па бутэльку. Ці на канапе ляжаць... Мне з такімі і гаварыць няма пра што.

Міхаіл Рыгоравіч катаецца на роварах, зімой — на каньках і лыжах, амаль круглы год ходзіць з унукам у басейн, прычым бясплатна. Тлумачыць, што выканкам дае на рэабілітацыйны цэнтр Беларускага таварыства інвалідаў некалькі бясплатных абанементаў. «Як сядзеш на канапу — так ужо і не ўстанеш, гэта я дакладна ведаю», — кажа ён, і я разумею, што наш герой ніякі не звышчалавек. Ён такі ж, як усе, а розніца з тымі, хто ляжыць на канапе перад тэлевізарам, толькі ў тым, што ён проста прымушае сябе ўстаць.

— Мне было 59 гадоў, і раптам я адчуў, што рэзка пачаў драхлець, — успамінае мужчына. — Неяк раніцай устаў з ложка, выглянуў у акно... а ў мяне пад ім школьны стадыён, дзе ўзімку заліваюць каток. І гляджу, людзі катаюцца... А я ў свае 59 гадоў растаўсцеў, важыў 107 кг, дайшоў да 62 памеру... Я што зрабіў: паехаў у Ждановічы на «поле цудаў» (знакаміты сталічны блышыны рынак) і набыў там за 20 тысяч рублёў «бэушныя» канькі. І на наступны дзень пайшоў на гэты каток. Да гэтага апошні раз стаяў на каньках у школе, у 11 класе — гэта было ў 1966 годзе!.. Вельмі хутка сышлі лішнія 20 кг, нават без усялякай дыеты. А ўсяго толькі трэба было раззлавацца на сябе!

«А калі хоць крыху расслабішся, ляжаш на канапу і ўключыш тэлевізар, то вось што адбываецца — пачынаеш глядзець серыялы і пляскаць дзверцамі халадзільніка», — кажа наш герой, які на сённяшні дзень пры росце 1,85 м важыць 84 кг. І дадае, смеючыся: «Жонку вось толькі сваю не магу нікуды выцягнуць, яна ў мяне дамаседка!».

## Шампанскае пад вадой, сустрэча з Гагарыным, порты Паўднёвага Сахаліна

Зрэшты, Міхаіл Заржыцкі заўсёды быў актыўны. У школе марыў стаць мараком, запісаўся на курсы падводнага плавання. А потым паехаў паступаць у Адэсу ў Вышэйшае мараходнае вучылішча, але з-за зроку не прайшоў медкамісію.

«Мне аддалі на рукі дакументы, а праз дарогу быў Адэскі інстытут інжынераў марскога флоту, — успамінае ён.

Потым хлопец заняў першае месца на спаборніцтвах і быў запрошаны ў якасці інструктара ў дайвінг-клуб, першы ў Савецкім Саюзе. «Адкрылі гэты клуб прадпрымальныя адэсіты, — кажа мой суразмоўнік. — На Фаросе, дзе тады адпачывалі першыя асобы савецкай дзяржавы, адэсіты наладзілі падводны турызм для ўсіх ахвотных, дастаткова было купіць пуцёўку. Мы іх навучалі пагружацца і ў канцы навучання на марскім дне каля скалы, дзе была глыбіня ў 42 м, звычайна пілі са сваімі турыстамі пад вадой шампанскае... Там, на Фаросе, я нават адзін раз з Юрыем Гагарыным сустрэўся. Ён адпачываў у санаторыі, убачыў нашу лодку і падплыў. Аказаўся вельмі простым хлопцам, мы яму далі паныраць з аквалангам»...

Пасля заканчэння інстытута нашага героя адправілі ва Уладзівасток, працаваць у групе падводных тэхнічных абследаванняў. «Я рабіў пашпартызацыю партоў Паўднёвага Сахаліна. Яны былі яшчэ японскай пабудовы, але японцы не захацелі пакінуць дакументацыю на іх, і нам прыйшлося афармляць пашпартызацыю самім, — кажа ён. — Я адпрацаваў там тры гады. Але захварэў мой бацька, і я вярнуўся ў Мінск. Пайшоў у будаўніцтва — у мяне дыплом быў з правам будаўнічых работ... Так да пенсіі тут, у Мінску, і прапрацаваў»...

## Англійская мова, салодкія тарты, радавод

— Цяпер вось ва ўніверсітэт трэцяга ўзросту запісаўся, хаджу на англійскую мову, — распавядае Міхаіл Рыгоравіч. — І на наступны год пайду абавязкова. Я пачаў разумець мову, мне гэта спадабалася. Да таго ж заняткі добра развіваюць памяць — для пажылых гэта важна. Яшчэ адзін плюс — стасункі з цікавымі і адэкватнымі людзьмі. Таму што ў паліклініцы бабулі, напрыклад, толькі пра хваробы гавораць. І яшчэ ўсе размовы пра тое, што ім нешта недадалі, падманулі... Усе хочуць, каб ім нешта далі. Але трэба самому «прачнуцца» трохі і нешта зрабіць. А ва ўніверсітэт трэцяга ўзросту прыходзяць людзі зусім іншага складу. Там такія бабулі ходзяць крутыя, некаторыя з іх «рассякаюць» па ўсім свеце...

Яшчэ крыху больш за два гады таму ў Міхаіла Рыгоравіча з'явілася такое не зусім звычайнае для мужчыны захапленне, як выраб тартоў. «Вось гэты малады чалавек вінаваты, — усміхаючыся, паказвае наш герой на свайго пяцігадовага ўнука Мірона. — Я да гэтага гатаваць зусім не ўмеў, хіба што пасмажыць яечню ці бульбу або пельмені зварыць, калі жонкі няма дома. А тут атрымалася так, што прыйшоў унук да мяне ў госці, і мы сталі гуляць на камп'ютары. Яму тады тры гадкі было. І раптам збоку выскачыла рэклама пернікавай хаткі. Ён убачыў і стаў прасіць: дзеда, зрабі мне такую! Прыйшлося рабіць, — смяецца мой суразмоўнік. — Знайшоў майстар-клас у інтэрнэце... Мучыліся-мучыліся, але зляпілі! А потым я захапіўся і стаў пячы тарты і піроржныя, прычым стараўся зрабіць іх незвычайнымі — у выглядзе кнігі, танка, гарматы і г. д.

А зусім нядаўна Міхаіл Заржыцкі захапіўся радаводам. «Хацелася б даведацца пра свае карані, — кажа ён. — Мае бацькі рана памерлі. Калі малады быў, не распытваў іх, а потым ужо не было каго. Засталіся старыя фатаграфіі — там, на іх, і афіцэры, і святары... Цікава было б даведацца пра сваіх продкаў, людзей, чыё прозвішча я нашу». Міхаіл Рыгоравіч хацеў пайсці на спецыяльныя курсы, але потым перадумаў: «Яны дарагія, каштуюць больш, чым мая пенсія. Так што буду займацца і вывучаць пытанне самастойна».

## Эпоха, здаровы сэнс, плюсы і мінусы кожнага часу

Ён робіць уражанне лёгкага чалавека. Нікога і нічога не асуджае, усяму спрабуе знайсці тлумачэнне. Успамінаем савецкія гады. «Не сказаць, каб была нейкая моцная настальгія», — кажа ён, але прызнае, што ў тых часах былі свае плюсы. Як і мінусы, зрэшты.

— З плюсаў, — успамінае, — не было праблем запісацца ў дзяцінстве ў любы гуртак або секцыю, і ўсё гэта бясплатна. Яшчэ былі выдатныя гульнятэкі ў Доме піянераў. І з работай было прасцей. З іншага боку, узровень матэрыяльнага жыцця быў ніжэйшы. Зараз толькі лянівы машыну не купляе: дастаткова сабраць некалькі тысяч, і можна купіць патрыманы аўтамабіль. А раней гэта было вельмі крута — мець машыну. Мне ў будаўнічым трэсце калісьці як пераможцу сацспаборніцтва выдзелілі права купіць аўто... І з жыллём цяпер лепш, чым у савецкія часы — але для тых, хто не «спіць», а нешта робіць, — лічыць ён. — Раней у Мінску была норма — шэсць квадратных метраў жылля на чалавека. Калі столькі ёсць, то нельга стаць у чаргу на пашырэнне кватэры. Вось нас чацвёра было ў сям'і, і ў нас кватэра крыху больш за 42 кв. м. Каб мець права стаць на чаргу на жыллё, у нас павінна было б пражываць больш за сем чалавек! Па савецкіх мерках мы б да гэтага часу ўсе разам жылі ў гэтай кватэры. У кожным часе можна знайсці і добрае, і дрэннае, нельга адназначна меркаваць пра эпоху, — разважае Міхаіл Рыгоравіч.

**«Мне было 59 гадоў, і раптам я адчуў, што рэзка пачаў драхлець. Неяк раніцай устаў з ложка, выглянуў у акно... а ў мяне пад ім школьны стадыён, дзе ўзімку заліваюць каток. І гляджу, людзі катаюцца... Я паехаў у Ждановічы на «поле цудаў» (знакаміты сталічны блышыны рынак) і набыў там за 20 тысяч рублёў «бэушныя» канькі. І на наступны дзень пайшоў на гэты каток».**

Цяжка з ім не пагадзіцца...

**Святлана БУСЬКО.**

***Фота з архіва героя (больш фота глядзіце на нашым сайце).***



Унуку Мірону вельмі падабаюцца дзедавы салодкія вырабы.

## Да ведама

# ЛІДЗІРУЕ ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

## Звыш 90 тысяч чалавек атрымалі дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу

**Па выніках 1 квартала 2018 года атрымальнікамі дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі (ДАСД) у нашай краіне сталі 90,3 тыс. чалавек, сума дапамогі склала 24,5 млн рублёў. Больш за ўсё атрымальнікаў ДАСД — у Гомельскай вобласці. За першы квартал бягучага года іх колькасць склала 16,4 тыс. чалавек (18,2 %). Пра гэта паведаміла падчас анлайн-канферэнцыі, якая праходзіла на сайце Міністэрства працы і сацабароны, начальнік галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Марыя ГАРБАЦЭВІЧ.**

На адрасную сацыяльную дапамогу (ДАСД), якая выдаецца ў выглядзе штомесячнай і аднаразовай сацыяльных дапамог, могуць разлічваць малазабяспечаныя людзі і тыя, хто знаходзіцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі.

Штомесячная сацыяльная дапамога выдаецца грамадзянам, у якіх сярэднедушавы даход за 12 месяцаў, што папярэднічаюць месяцу звароту па дапамогу, з аб'ектыўных прычын ніжэйшы за крытэрый патрэбнасці (з 1 мая 2018 года гэта складае 206,58 рубля), растлумачыла, адказваючы на пытанне, **начальнік аддзела арганізацыі сацыяльнай дапамогі і па справах ветэранаў галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Мінпрацы і сацабароны Галіна ЛАЗАРЭНКА.**

Па адначасовую сацыяльную дапамогу могуць звярнуцца грамадзяне, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, што парушае нармальную жыццядзейнасць, пры ўмове, што іх сярэднедушавы даход складае не больш чым 150 % за крытэрый патрэбнасці (з 1 мая 2018 года гэта складае 309,87 рубля).

Пры гэтым Галіна Лазарэнка адзначыла, што заканадаўствам устаноўлены дадатковыя ўмовы, якія дазваляюць ацаніць аб'ектыўнасць патрэбнасці ў аказанні такой дапамогі. Рашэнне аб выдачы ДАСД прымаецца раённай камісіяй, створанай мясцовым выканаўчым і распарадчым органам.

Па выніках 1 квартала гэтага года, штомесячная сацыяльная дапамога прызначана 23,7 тыс. чалавек на суму амаль 6,3 млн рублёў, аднаразовая сацыяльная дапамога — 12,3 тыс. чалавек на суму 1,7 млн рублёў.

Сацыяльную дапамогу для пакрыцця выдаткаў на набыццё падгузкаў атрымалі ў першым квартале гэтага года 39,4 тыс. чалавек — на агульную суму 11 млн рублёў. Прадуктамі харчавання забяспечана 14,9 тыс. дзяцей на суму 5,5 млн рублёў.

Найбольш распаўсюджаным відам ДАСД, па словах Марыі Гарбацэвіч, з'явілася сацыяльная дапамога для пакрыцця выдаткаў на набыццё падгузкаў — 43,6 %.

**P.S.** Больш падрабязна аб анлайн-канферэнцыі вы зможаце прачытаць на наступным тыдні.

**Святлана БУСЬКО.**




## ТРЫСТА ГРАМАЎ ЧАРНАСЛІВУ

Бывае ў жыцці такое, што каб і хацеў, не прыдумаеш, а тут стаіш — назіраеш і не ведаеш, смяяцца ці плакаць.

Крама, значыць. Хударлявы пажылы мужчына пенсійнага ўзросту пытае ў прадавачкі (а «тая баба — сем пудоў сама меней важыць»...):

— У вас чарнасліў з костачкай ці без?

— Яго толькі што прывезлі. Адкуль я ведаю? — адмахваецца жанчына.

— Дык вы паспытайце, — падказвае ёй пакупнік.

— З чаго б гэта? Мне — нельга.

— Тады давайце я зраблю.

— Яшчэ што выдумайце! Вы паспытаеце, а мне за вас адказвай... Тут усюды камеры стаяць... Так што купляйце і каштуйце... Ці рабіце што хочаце!

— Добра, узважце дзве штукі, — згаджаецца мужчына і тут жа б'е адбой. — Я што, — абураецца, — з-за двух чарнаслівін павінен у чарзе да касы стаяць? Ці вы ў таваразнаўца якога спытаеце, што вам прывезлі?!

— А чаму гэта я павінна спытаць? Схадзіце самі.

— Ну і пайду, — не здаўся мужчына. — Дзе ён у вас сядзіць?

— Не ён, а яна... І сёння ў адгуле, — сказала прадавачка, захоўваючы спакой сфінкса. — Вунь у зале адміністратар стаіць, падыдзіце да яе.

Пенсіянер падаўся ў бок дамы ў белым халаце.

— Калі ласка, дапамажыце вырашыць праблему, — папрасіў жанчыну, пад ручку падвёўшы да прылаўка. — Скажыце, чарнасліў у вас з костачкай ці без?

Можа, на пуд лягчэйшая адміністратарка падышла да латка з сухафруктамі, узяла адну чарнаслівіну і адправіла яе ў... рот — на экспертызу.

— Без костачкі, — сказала яшчэ не зжаваўшы.

— Ну калі так, — з палёгкай уздыхнуў пакупнік, — узважце мне 300 грамаў.

Прадавачка зачарпнула саўком чарнасліву, насыпала яго ў пакет, паклала на вагу, напісала цану і — падала мужчыну. Той (і нарэшце!) атрымаў жаданае, мусіць, не вельмі верачы, абмацаў фрукт у пакеце і тонам сапраўднага следчага прадавачцы сказаў:

— Вось, паглядзіце, я біру прадукт, націскаю на яго пальцамі і адчуваю, што ён без костачкі! Вы ж маглі б зрабіць тое самае?

— Мужчына! Не пудрыце мне мазгі! — праз прылавак кажа яму прадавачка.

— Ды гэта вы іх пудрыце! — пераможна заяўляе пакупнік. — Дайце мне кнігу скаргаў!

— А навошта?.. Вы хацелі ўзяць трыста грамаў чарнасліву без костачкі і вы іх узялі. Дык ідзіце ў касу, плаціце і нясіце дамоў — зрабіце радасць жонцы альбо ўнукам...

Пакупнік хацеў нешта адказаць, але патрэбных слоў, відаць, не знайшоў: махнуў рукой і рушыў да касы — з «паднятымі» нервамі, з горкім прысмакам крыўды...

Не вам казаць, яшчэ многія так сыходзяць (з рынкаў, з крамаў, з цырульняў, з аптэк) — не «высвятляючы адносін», нікому нічога не кажучы...

І пакуль мы будзем маўчаць, нас будуць так абслугоўваць.

**Валянціна Паліканіна,** *г. Мінск.*

## ПАМЫЛІЛІСЯ

У першыя пасляваенныя гады нашы вяскоўцы рэдка траплялі ў горад, але ж тады адразу бачылі, што жыццё там наладжваецца куды хутчэй: будуюцца дамы, адкрываюцца розныя крамы, працуюць клубы, кінатэатры...

Дык вось. Акурат у тыя часы мы з сябрам Толікам трапілі ў Мазыр. Першае, што зрабілі, — пакаштавалі марозіва з папяровых кубачкаў. Потым з нейкіх дзіўных жалезных скрынак папілі газіроўкі. Аўтаматы, праўда, спрацоўвалі не заўжды: бывала, капейкі бралі, а вады не лілі... Тады мы — як дарослыя, як гарадскія — стукалі па іх кулакамі.

Але ж самае цікавае нас чакала наперадзе: у кінатэатры ішоў фільм «Чапаеў», і мы скіравалі туды.

Напэўна, трохі спазніліся, бо ні ў акенцы касы, ні ў фае ўжо нікога не было. Адзінае — у супрацьлеглым баку стаялі нейкія хлапчукі — ну вельмі да нас падобныя. Мы рушылі да іх, каб спытаць пра кіно. І тут жа заўважылі, што яны... ідуць да нас. Мы спыняемся, пачынаем, што называецца, крывіць морды... Яны ў адказ! Мой сябар Толік, не разумеючы, што гэта, адступіў назад. Тое ж самае зрабіў хлопчык, які быў падобны на яго...

Толькі тут я прыгледзеўся да хлопчыка, які змахваў на мяне, і зарагатаў, бо зразумеў, што насупраць добрую палову сцяны займае... люстэрка.

...Нешта падобнае ў тыя ж часы адбылося і з нашай цёткай Хвядорай. У Мазыры яна зайшла ў краму адзення, што была каля цэнтральнай плошчы, і ўбачыла там сваю сястру.

— І ты тут, Мальвіна? — спытала з радасці цётка.

А Мальвіна ёй не адказвае: яна пра тое ж... пытае.

Хвядора ў крыўду, бо даўно ж не сустракаліся, а яна, бач, крыўляецца... За гэта ж толькі вушы надраць!

Працягнула яна руку, а там ніякай Мальвіны: люстэрка на ўсю сцяну. Хвядора нават абмацала яго і ўзрадавалася, што не трэба на сястру крыўдаваць.

**Анатоль Кашэвіч,** *Лельчыцкі раён.*

## ЖАХ — ГЭТА ПА-НАШАМУ

...Дзед Панкрат — чалавек неблагі, памяркоўны, з гумарам, любіць некага падкалоць, некаму памагчы (адзінокіх старых у вёсцы нямала), але ж за гэта і плату бярэ — вадкай валютай. З-за яе, праклятай, жонка ўсе нервы спаліла: і прасіла яго, каб супыніўся, і лаяла, і пагражала, а ў таго, што называецца, у адно вуха ўляцела, у другое вылецела. Гэта значыць, што дзень-другі чалавек «прапусціць», а потым зноў за сваё: дадому ідзе — за платы трымаецца, назаўтра кажа, што «трубы гараць» — трэба затушыць. Ну і «тушыць»...

Але ж у унукі ўсё роўна яго любілі. Адзін нават мянушку даў. Імя як належыць вымавіць не мог, — зваў дзедам Дакратам. Вяскоўцы ў гэтае імя адну літарку ўставілі — стаў Дамкратам. І лішні козыр займеў. Казаў: «Што — я з такой мянушкай ды чарку падняць не магу?!»

І раптам як падмянілі чалавека — ні кроплі ў рот! Няўжо «завязаў»? Але як?

Сам ён нікому нічога не сказаў, Кацярына, жонка яго, прабалбаталася. «Неяк у нядзельку, — па сакрэце расказала яна, — захацела я ў суседнюю вёску да дачкі сваёй з'ездзіць. Думала да абеду дамоў вярнуся, але ж затрымалася — на змярканні прыкацiла. Свінні — яшчэ здалёк пачула — галодныя, хлеўчык разносяць, карова не доеная мычыць... Значыць, думаю, гаспадар мой нічога не рабіў.

Адчыніла дзверы, — так яно і ёсць. Панкрат на ложку каля акна храпе — аж занавескі гайдаюцца, перагарам у хаце смярдзіць так, што ўчадзець можна...

Я давай вокны расчыняць, каб паветра змянілася, давай свіней карміць...

Усё парабіла — засталося толькі карову падаіць.

Зайшла ў хату, каб дайніцу ўзяць, а там... Карціна Рэпіна «Не чакалі». Рагуля наша ўсунула галаву ў акно — якраз над ложкам, дзе Панкрат мой спаў. І языком па твары яму... Адзін раз, потым другі...

Той зенкі прадраў, у мызу рукамі ўпёрся ды крычыць: «Не! Я ніякуюз табой не пайду!.. За што? Я ж нікога не крыўдзіў?! Хіба Кацю калі...»

Тут жа згледзеў мяне. Пытаецца: «А ты тут чаго?.. Я — вядома — гарэлку піў...»

Карова ў гэты час: «Ну-у-у-у» і зноў з языком, каб Панкрата лізнуць...

Я закрычала на яе, замахала, рагуля адступілася — вырвала галаву з акна (шчасце, што рам не пакрышыла... Пытаю ў Панкрата: «Ну што — дапіўся?» А ў яго, бачу, дзікі страх у вачах і слёзы адтуль што боб...

Пасля ўжо трохі супакоіўся, кажа: «Я ж думаў, што памёр, што гэты нячысцік рагаты па мяне прыйшоў, каб у пекла завесці».

...З тога жаху працверазеў Панкрат: слова даў, што болей — ні-ні, трымаецца. Дай бог надоўга.

**Галіна Нічыпаровіч,** *в. Магільна, Уздзенскі раён.*

## ПЕРАКАНАЎЧЫ АДКАЗ

Гэтага чалавека і ў сталым узросце звалі проста Васілёк. Энергічны быў дзед, вясёлы, хоць і адзінокі — дажываў свой век у невялічкай хатцы, любіў успамінаць мінулае. Расказваў, якім ён хлопцам быў (статным ды прыгожым), як спадабаўся пану Богушу і як той наняў яго ў фурманы. Прычым не проста, а на два тыдні ў Мазыр вучыцца паслаў!..

Ну і далей — з якім свістам, на шасцёрцы прыгожых коней, ён, разадзеты, пад'язджаў да чыгункі, каб сустрэць гаспадара, калі той вяртаўся з Санкт-Пецярбурга, як вёз яго ў маёнтак, а ўсе іншыя паны (не кажучы ўжо пра людзей звычайных) пазіралі на экіпаж ды зайздросцілі...

Трэба сказаць, што дарога да маёнтка была няблізкая — ехалі некалькі гадзін. Не дзіва, што часам хацелася і спыніцца — па якой-небудзь маленькай ці вялікай патрэбе. Васіль тады хуценька бег у лес і тут жа вяртаўся.

Дык вось неяк, заўважыўшы гэта, пан Богуш папрасіў:

— А скажы мне, Васілёк, чаму гэта вы, мужыкі, так хутка спраўляецеся? Бо мы, паны, дык нашмат марудней.

— Я, паночку, — з павагі да вас ну нідзе не магу затрымацца.

— Ды я не пра цябе пытаюся, я наогул...

— Тады падумаю, — паабяцаў фурман.

І абодва яны змоўклі. Едуць сабе далей — і пяць вёрст, і дзесяць...

Першым голас падае пан:

— Васілёк, — просіць, — спыні нашых коней, я да ветру схаджу.

— Ну, што вы, паночку, тут нельга: тут дзеўкі ягады збіраюць. Як жа вы пойдзеце? — кажа фурман і падганяе запрэжку.

Едуць яшчэ кіламетр-другі, пан зноў кажа:

— Спыні...

— Ну што вы, паночку, тут таксама месца няўдалае: тут людзі дровы сабе пілуюць.

І зноў па конях.

Пан неўзабаве ў крык:

— Стой, пся крэў!

І з фурманкі, можна сказаць, на хаду, як той заяц. І ў лес...

Праз хвіліну-другую вяртаецца, садзіцца, дае каманду ехаць. А заадно строга пытае ў фурмана:

— Ты што сабе дазваляеш? Чаму я мусіў цярпець?..

— Дык вы ж, паночку, нештачка пыталі... Вось я і адказаў.

— Ну ты шэльма! Ну маладзец! Ты ж не толькі адказаў, ты яшчэ і паказаў мне! — праз смех прамовіў пан і пасля гэтага хвілін з дзесяць яшчэ смяяўся.

**Уладзімір Пугач,** *м. Навасёлкі, Петрыкаўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***<u>Ад яе ж.</u> Пішыце! Конкурс на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю працягваецца.***

■ Неасабісты суб'ектыў



# ЛЕПШ ДАГАНЯЦЬ, ЧЫМ ПАЧАКАЦЬ...

## Ці ўсё-ткі наадварот?

Сёння, напэўна, ці не ў кожнага знойдзецца або сваяк, або добры знаёмы, які цягам апошніх трыццаці гадоў пакінуў Радзіму і атабарыўся ў далёкім ці крыху бліжэйшым замежжы. Быў такі адрэзак часу, калі наша народнае «Добра там, дзе нас няма» не спрацоўвала, і ў пошуках уяўных даброт усе імкнуліся менавіта туды, дзе нас дагэтуль не было. Асабліва дзяўчаты, спакушаныя магчымасцю формулу «выйсці замуж за іншаземца», якая была, дый сёння для многіх застаецца тоеснай «выйсці замуж удала», прымяніць на свой лёс. Цяпер гэтыя летуценныя дзяўчынкі ўжо саракапяцігадовыя самавітыя цёткі, яны вывучылі мову, атрымалі від на жыхарства, а то і грамадзянства. Настальгуюць па Радзіме, нават часам сюды прыязджаюць. Хтосьці жыве там, за мяжой, лепш, хтосьці горш, але тут усім гавораць, што добра. А што яшчэ казаць, калі тады самі зрабілі свой выбар?

Зрэшты, пра выбар — гэта занадта гучна. Мы нядаўна з сяброўкай сядзелі і ўспаміналі нашых аднакурсніц, прыяцелек і калег, якія за мяжой апынуліся. І, вы ведаеце, — у многіх такія пакручастыя гісторыі, такія супадзенні, якіх не бывае, што пачынаеш верыць у наканаванасць, у лёс, які, як вядома, ні на якім кані не аб'едзеш, у вечнае бабуліна: «Планета ў яе такая»...

Вось, да прыкладу, Марына. Працавала на радыё, акрамя журфака, скончыла яшчэ лінгвістычны ўніверсітэт. На ўзроўні ведала англійскую і нямецкую, пісала кандыдацкую дысертацыю. Нікуды з'язджаць, у адрозненне ад многіх дзяўчат у той час, нават не думала. Дзякуючы веданню моў, уладкавалася на радыёстанцыю, якая вяшчае за мяжу. Як журналіст гэтай радыёстанцыі пайшла браць інтэрв'ю ў нямецкае пасольства. Там на яе паклаў вока яе суразмоўнік — малады перспектыўны дыпламат. У яе ён таксама выклікаў пэўную сімпатыю... Не, вы не ўгадалі, яны не пабраліся шлюбам. Ён проста запрасіў яе з'ездзіць з ім у Германію. Там у яго былі нейкія справы, таму яна шмат гуляла адна, хадзіла ў музеі, на выставы. І там убачыла Яго — якога чакала ўсё жыццё. Пазнаёміліся павярхоўна: ён працаваў з групай рускіх турыстаў, але пакінуў сваю візітоўку. Яна яму па электроннай пошце напісала запрашэнне прыехаць у Мінск. І ён — прыехаў, з парога заявіўшы: «Я прыехаў да цябе»... Яны разам ужо гадоў пятнаццаць, жывуць у Берліне, гадуюць дваіх дзетак. Жывуць не вельмі багата, але шчасліва... Што стала з тым перспектыўным дыпламатам — гісторыя замоўчвае. Пэўна, ужо даслужыўся да пасла.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2203.

Нумар падпісаны ў 19.30 14 чэрвеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

15 чэрвеня 2018 г. № 24 (457)




стар. 3

**Тысячы руж у падарунак**



стар. 14

**Як жывеш, глыбінка?**



стар. 16

**Што адбываецца з лазнямі**

ТЭМА ТЫДНЯ

# ТЭРЫТОРЫЯ ДАПАМОГІ

У аддаленых вёсках краіны доля людзей старэйшага ўзросту складае 80—90 %. На якія сацыяльныя паслугі могуць разлічваць сталыя вяскоўцы?



Здымак носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання ў г. Ушачы.

**У СВАЕ 87 гадоў Вера Рыгораўна засталася адна: муж памёр, дачка жыве ў Мінску, сын — у Расіі. У такім узросце жыць адной у вёсцы нялёгка, асабліва зімой: паліць печку, насіць ваду, расчышчаць дарожкі ад снегу, чакаць аўтакраму з прадуктамі — усё гэта ўжо становіцца складаным. І такіх пажылых людзей, якія пражываюць асобна ад дзяцей і сваякоў, з кожным годам становіцца ўсё больш. Але пакідаць свае родныя дамы і з'язджаць да дзяцей яны, як правіла, не хочуць. Тут родная хата, агарод, усё жыццё прайшло ў гэтых сценах, як жа іх пакінуць на схіле гадоў?**

стар. 4

ВЕКТАР РУХУ

# ЛІЧБАВАЯ ЭКАНОМІКА ДЛЯ ВЁСКІ



Шклоў — адзін з райцэнтраў вобласці, дзе працуюць высокаэфектыўныя сельскія гаспадаркі.

## Шляхі стварэння агульнай моцнай сельскай гаспадаркі абмеркавалі на пасяджэнні ў Шклоўскім раёне парламентарыі Беларусі і Расіі

**Выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні прайшло ў рамках падрыхтоўкі да V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі Аляксандра ПАПКОВА быў разгледжаны шэраг пытанняў, якія датычыліся, можна сказаць, рэвалюцыйных пераўтварэнняў у сельскай гаспадарцы. Усё гэта адпавядала тэме размовы «Устойлівае развіццё сельскіх тэрыторый як найважнейшы фактар гарантавання эканамічнай бяспекі рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў рамках Саюзнай дзяржавы». У пасяджэнні прынялі ўдзел аўтарытэтныя расійскія дэпутаты — намеснік старшыні Камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі па аграрна-харчовай палітыцы і прыродакарыстанні Сяргей МІЦІН і член Камітэта Савета Федэрацыі па федэратыўным упарадкаванні, рэгіянальнай палітыцы, мясцовым самакіраванні і справах Поўначы Андрэй ШАЎЧЭНКА. У паслужным спісе Сяргея Міціна такія пасады, як намеснік міністра сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі, губернатар Наўгародскай вобласці. Андрэй Шаўчэнка прадстаўляе навуку, бізнес.**

### СТАЎКА НА СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

Шклоў для правядзення пасяджэння быў абраны невыпадкова. Менавіта тут выпрабоўваюцца інавацыйныя праекты па стварэнні сельгаспрадпрыемства новага пакалення, вёскі будучыні. Тут працуе прыватная гаспадарка, на ўзбраенні ў якой знаходзяцца лічбавыя тэхналогіі, арганізавана паказальная буйная таварная вытворчасць. Адным словам, ёсць на што паглядзець і чаму павучыцца.

— Гэта пасяджэнне і іншыя, якія мы будзем праводзіць, сведчаць пра тое, што мы вядзём вельмі сур'ёзную падрыхтоўку да V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, — паведаміў яшчэ на пачатку работы Аляксандр Папкоў. — У нас ёсць станоўчыя прыклады ў сельскагаспадарчай галіне. Вельмі вялікі вопыт напрацаваны ў Расійскай Федэрацыі. Усе гэтыя напрацоўкі, якія будуць зроблены ў працэсе падрыхтоўчых мерапрыемстваў, мы агучым на секцыі форуму і, магчыма, калі атрымаецца, выйдзем на міждзяржаўныя пагадненні. Каб бачыць, у якіх кірунках рухацца.

Праблем, у вырашэнні якіх добра было б аб'яднаць намаганні, шмат. Дамінантай развіцця аграпрамысловага комплексу Беларусі стала буйная таварная вытворчасць, але пры гэтым ёсць пытанні па збыце, адзначыў Аляксандр Папкоў. Беларускі бок зацікаўлены састыкаваць з Расіяй намаганні па вытворчасці сістэм сельскагаспадарчых машын і працаваць на адзіны комплекс.

стар. 2

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Глабальны трэнд, у якім трэба ўдзельнічаць

## Сенатар заклікала моладзь падключыцца да дасягнення Мэт устойлівага развіцця

**У сераду, 13 чэрвеня, па запрашэнні студэнтаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Мар'яна ШЧОТКІНА сустрэлася з будучымі педагогамі.**



Фота БелТА.

— Ніводная добрая справа без моладзі ніколі не будзе зроблена, — растлумачыла віцэ-спікер верхняй палаты беларускага парламента журналістам мэту сустрэчы. — Крэатыўнасць, творчы патэнцыял, актыўнасць моладзі павінны быць ўцягнутыя ў рэчышча жыцця. Зараз распрацоўваецца праект Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця да 2035 года, і, канешне, тыя думкі, тыя ідэі, тыя асноўныя стратэгічныя палажэнні, якія павінны быць закладзеныя ў гэтую праграму, павінны ісці ад моладзі, ад людзей і мець на ўвазе павышэнне ўзроўню і якасці жыцця людзей. Пры распрацоўцы любой праграмы, стратэгіі, пры прыняцці любога рашэння галоўнае — чуць меркаванні, розныя, часам альтэрнатыўныя, бо ісціна заўсёды пасярэдзіне і будзе знойдзена кампрамісна, але абавязкова з удзелам не толькі выканаўчай і заканадаўчай улады, але і грамадскай супольнасці. Моладзь кажа адкрыта і смела тое, што думае. Таму гэты дыялог вельмі карысны, перш за ўсё для мяне і для ўсіх нас.

Нацыянальны каардынатар падкрэсліла, што роля будучых педагогаў вельмі важная для дасягнення ўсіх 17 Мэт устойлівага развіцця, бо ў кожнай з іх мае значэнне адпаведны ўзровень адукацыі як грамадства ў цэлым, так і тых, хто прымае рашэнні. Мар'яна Шчоткіна нагадала лозунг амерыканскага эколага Дэвіда Браўэра «Думаць глабальна, дзейнічаць лакальна». «Трэба перш за ўсё перабудоўваць сваю свядомасць на дасягненне ўстойлівасці: як спажываць рэсурсы, як ставіцца да прыроды, якім чынам кожны з нас асабіста можа ўздзейнічаць на тое, над чым працуе ўсё грамадства, — лічыць Мар'яна Шчоткіна. — На гэтай сустрэчы не проста студэнты, але — будучыя настаўнікі. Ад настаўніка залежыць вельмі шмат. Гэта аўтарытэт для дзіцяці. Вельмі важна, якія думкі ён будзе несці, якія каштоўнасці, традыцыі закладзе ў адукацыйны працэс. У час інтэрнэту масіў інфармацыі цалкам даступны, але трэба ўмець ім распараджацца і фарміраваць у сябе і ў навакольных духоўнасць і ашчадныя адносіны адзін да аднаго. А гэта закладаецца ў дзяцінстве».

Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт шмат робіць для таго, каб падрыхтаваць сваіх выпускнікоў для рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця, паведаміў **рэктар БДПУ Аляксандр ЖУК:** «У нас створаны Каардынацыйны цэнтр «Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця», функцыянуюць дзве студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі. Мы правялі дэкаду «Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця» і рыхтуем яшчэ шэраг форумаў».

У гутарцы са студэнтамі нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця падкрэслівала, што кожны чалавек індывідуальны, кожны мае ў сябе закладзеную геніяльнасць і можа ўплываць як на ўласнае будучае, так і на будучае ўсёй краіны і нават цывілізацыі. «Устойлівасць мае на ўвазе развіццё без шкоды для наступных пакаленняў. Мы павінны перадаць нашчадкам сваю краіну і планету ў стане не горшым, чым пры нашым спажыванні яе рэсурсаў», — тлумачыла яна важнасць разумення людзьмі іх укладу ў аблічча заўтрашняга дня.

Мар'яна Шчоткіна звярнула ўвагу на тое, што сёння самая галоўная пагроза — страта даверу паміж дзяржавамі, страта шчырасці. «Таму толькі салідарнасць, толькі партнёрства можа выратаваць свет у цэлым, бо гэта забяспечыць умовы для даверу», — казала яна маладым людзям.

Нацыянальны каардынатар расказала пра механізм кіравання працэсам па дасягненні Мэт устойлівага развіцця і заклікала моладзь удзельнічаць у партнёрскай групе, якая носіць адкрыты характар.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ЛІЧБАВАЯ



На тэрыторыі гаспадаркі «Дзіяна» было чым уразіцца.

Ёсць праблема з арганізацыяй селекцыйна-генетычных цэнтраў, падрыхтоўкай кадраў для АПК і іншыя. Расійскі бок таксама зацікаўлены ў сумесных праектах і дзеяннях.

— За пяць апошніх гадоў прырост агульнай сельскагаспадарчай прадукцыі склаў у нас 15 %, летась мы сабралі рэкордны ўраджай збожжавых — 135 мільёнаў тон, — адзначыў Сяргей Міцін. — Мы ўпершыню за апошнія гады ў канкурэнтнай барацьбе практычна выціснулі з нашага рынку мяса птушкі замежных пастаўшчыкоў. Насыцілі гэтай прадукцыяй свой рынак і зараз пастаўляем яе ў краіны арабскага свету. Між тым існуе шэраг сур'ёзных праблем. Тое ж малако. Расіі малака не хапае, мы спажываем яго каля 240 кілаграмаў на чалавека — а гэта менш за біялагічную норму, якая складае 340 кілаграмаў. З іншага боку, перыядычна ўзнікаюць праблемы са збытам малака як для расійскіх сялян, так і для беларусаў. Урадам абедзвюх краін трэба абмяркоўваць, якія меры прыняць, каб такога не было. Вельмі сур'ёзныя пытанні стаяць і перад перапрацоўчай прамысловасцю. Пры росце аб'ёму сельскагаспадарчай вытворчасці на 15 % аб'ём прадуктаў харчавання вырас адчувальна менш. І атрымліваецца пры росце сельгасвытворчасці, што амаль 30 % прадуктаў харчавання імпартуецца. Сёння Савет Федэрацыі стварыў спецыяльную

> Беларускі бок зацікаўлены састыкаваць з Расіяй намаганні па вытворчасці сістэм сельскагаспадарчых машын і працаваць на адзіны комплекс.

часовую камісію па распрацоўцы мер дзяржпадтрымкі для развіцця машынабудавання, харчовай і перапрацоўчай прамысловасці. Нам цікава паглядзець, як з гэтай праблемай спраўляюцца беларусы.

## З ДАКЛАДНАСЦЮ ДА САНТЫМЕТРА

Сялянска-фермерская гаспадарка Уладзіміра Маліноўскага «Дзіяна» — адна з паспяховых у краіне. У спецыяліста вялікі вопыт работы ў дзяржаўных аграгаспадарках, але з 1991 года ён працуе выключна на сябе. «Дзіяна» была створана на плошчы 50 гектараў і першапачаткова гэтыя землі апрацоўваліся выключна сямейным падрадам. На той момант два сыны фермера былі старшакласнікамі, а дачцэ Дзіяне, у гонар якой і названая гаспадарка, споўнілася дзевяць гадоў. Зараз дачка і адзін з сыноў — Дзмітрый — працуюць на роўных з бацькам. Сын адказвае за лічбавыя тэхналогіі, на якіх тут зараз базіруецца ўся работа. Вынікі працы ўражваюць. Летась ураджайнасць бульбы склала 413 ц/га на плошчы 750 гектараў, збожжа намалацілі 74 ц/га. Падчас экскурсіі па гаспадарцы была магчымасць даведацца, як удалося гэтага дабіцца.

— Вельмі актыўна працуем з новымі тэхналогіямі, знаходзімся ў пастаянным пошуку падыходаў, аптымізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. За апошнія 3-4 гады вялікія зрухі адбыліся па лічбавых тэхналогіях. У нас тут устаноўлена апорная станцыя спадарожнікавай сістэмы дакладнага пазіцыянавання, якая забяспечвае дакладнасць праходу машын да двух з паловай сантыметраў! Гэта дае магчымасць эканоміць паліва, грошы, насенне і ўгнаенні. Рэнтабельнасць вытворчасці за 2016 год склала 53 %, летась 46 %, — расказаў Уладзімір Маліноўскі.



**Аляксандр ПАПКОЎ: «Наша сельская гаспадарка павінна выйсці на новы ўзровень».**

Летась амаль на 1,5 тысячы гектараў зямлі «Дзіяны» вырошчваліся бульба, азімая і яравая пшаніца, ячмень, рапс, грэчка. Сёлета ўладанні пашырыліся амаль да 3 тысяч гектараў. Акцэнт робіцца на бульбаводства. Летась шмат бульбы гаспадарка паставіла ва Узбекістан, Казахстан, Расію, Малдову, Украіну.

> **Разумная тэхніка, якая працуе ў полі па зададзенай праграме, выключна замежная.**
>
> **— Беларускія машыны пакуль гэта рабіць не ўмеюць, — прызнаецца гаспадар. — Але для перавозкі ўраджаю нічога лепшага за наш трактар МТЗ 8082 не прыдумаеш: танна, хутка, высокая праходнасць.**

Для мабільнасці гаспадаркі тут шмат чаго зроблена. Чатыры гады таму сертыфікавалі структурнае будаўнічае падраздзяленне, атрымалі ліцэнзію на правядзенне работ. Усе будынкі на тэрыторыі гаспадаркі пабудаваны сваімі сіламі. Металаканструкцыі таксама тутэйшай вытворчасці. Гаспадарка, дарэчы, працуе без крэдытаў. У куплю тэхнікі, матэрыялаў, у будаўніцтва і гэтак далей укладваюцца толькі тыя грошы, якія зараблі. Зараз, напрыклад, будуецца новае бульбасховішча на 40 тысяч тон.

Сакрэт поспеху гаспадаркі — навуковы падыход плюс лічбавыя тэхналогіі, удакладняе гаспадар.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*



У цэху перапрацоўкі мяса ААТ «Александрыйскае».

### ❍ У тэму

**Аляксандр ПАПКОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні:**

— Гэта пасяджэнне праводзіцца ў мэтах арганізацыі найбольш эфектыўнай работы V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Мы выносім для абмеркавання цэлы пералік напрамкаў, якія сёння хвалююць Саюзную дзяржаву. Мы паглядзелі дзве формы ўласнасці — фермерскую гаспадарку і буйную таварную вытворчасць. Мы бачылі станоўчыя прыклады, але нам трэба мець на ўвазе і адмоўныя, каб працаваць над імі і ўдасканальваць наша заканадаўства. Мы пабачылі, як ствараецца сучасная прадукцыя, запатрабаваная на рынках Беларусі і Расіі. Але нам трэба падумаць, якім чынам гэтую прадукцыю прапаноўваць. На жаль, шмат рынкаў сёння запоўнена. Нам трэба напрацоўваць такія сумесныя праграмы, якія насілі б сур'ёзны паглыблены характар. Мы павінны рашаць, якім чынам на аснове лічбавых тэхналогій стварыць машыны новага пакалення, дакладнага земляробства. Яшчэ адна праблема, якая нас сёння хвалюе, — адсутнасць селекцыйна-генетычных цэнтраў, якія маглі б напрацаваць адпаведныя падыходы па імпартазамяшчэнні. Пакуль мы цалкам залежым ад імпарту. Нас хвалюе таксама адсутнасць перапрацоўкі лёну. Мы яго прадаём як сыравіну. А гэта нявыгадна, трэба фарміраваць дабаўленую вартасць. Праблем шмат, і мы б хацелі на форуме выйсці на нейкія міждзяржаўныя рашэнні з тым разлікам, каб, сумясціўшы нашы інтарэсы, агульнымі намаганнямі стварыць новыя эфектыўныя напрамкі.

# ЭКАНОМІКА...

❍ У тэму

**Сяргей МІЦІН, старшыня Камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі па аграрна-харчовай палітыцы і прыродакарыстанні:**

— Мы ўбачылі дзве зусім розныя гаспадаркі, але яны абедзве высокаэфектыўныя. Што датычыцца «Дзіяны», вынікі ўражваюць. У маёй роднай вобласці да 30 тон бульбы з гектара збіраюць, і гэта лічыцца нядрэнна, а ў яго — 41! У нас сярэдняя ўраджайнасць збожжавых па краіне 29 ц/га, а ў яго 74. Трэба хапаць гэтыя тэхналогіі і ўкараняць. Мы паспрабуем гэта нейкім чынам трансфармаваць на нашу тэрыторыю. Мы бачылі суперсучасную тэхніку, і я не пабаюся сказаць, што гэта тэхніка XXI стагоддзя. Уражвае і тое, што гэта адбываецца не дзесьці ў буйным індустрыяльным цэнтры, а ў невялічкай вёсцы. І людзі, якія там працуюць, звычайныя тутэйшыя жыхары. Гэта і ёсць тая самая перадавая сельская гаспадарка, якая сёння неабходная. Вучоныя падлічылі, што да 2050 года насельніцтва Зямлі складзе 10 мільярдаў чалавек. Спатрэбіцца на 60 % павялічыць вытворчасць прадуктаў харчавання. І ў Расіі, і ў Беларусі ёсць пэўныя рэсурсы і рэзервы, калі ствараць такія эфектыўныя гаспадаркі, як у Маліноўскага. Наогул, усё, што мы ўбачылі, выклікае адабрэнне. Наша сустрэча ў рамках форуму будзе праходзіць пад знакам развіцця сельскіх тэрыторый. Для Расійскай Федэрацыі гэта вельмі важна. У нас 39 мільёнаў чалавек жыве на вёсцы. І ад таго, як яны будуць існаваць, эфектыўна працаваць, залежыць моц дзяржавы.



Сяргей МІЦІН: «Моц любой дзяржавы залежыць ад эфектыўнасці працы на вёсцы».




Смачная прадукцыя ААТ «Александрыйскае».

## АД ПОЛЯ ДА ПРЫЛАЎКА

Прыярытэтным напрамкам АПК Беларусі стала развіццё высокаэфектыўнай буйной сельскагаспадарчай вытворчасці. І ўдзельнікі пасяджэння азнаёміліся з ёй на прыкладзе ААТ «Александрыйскае». Гаспадарка была створана на працягу 2005—2008 гадоў шляхам рэарганізацыі пяці стратных гаспадарак. У 2013-м да яе далучылі Шклоўскі камбікармавы завод. Сельгаспрадпрыемства спецыялізуецца на жывёлагадоўлі і раслінаводстве. На яго фермах гадуецца 27 тысяч галоў свіней, больш за 16 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, птушка. Раслінаводства працуе на жывёлагадоўлю, якая мае поўны замкнёны цыкл. Ёсць цэхі забою і перапрацоўкі мяса. За мінулы год «Александрыйскае» атрымала выручку 52 мільёны долараў, спрацавала з рэнтабельнасцю 7 %.

— Задача прадпрыемства — атрыманне прадукту ад поля да прылаўка, — кажа **дырэктар ААТ «Александрыйскае» Андрэй КУЗЬМЕНКА.**

Сёлета тут запатэнтавалі гандлёвую марку і прасоўваюць яе на расійскі рынак. З гэтай мэтай адкрыта гандлёвае прадпрыемства ў Маскве «Александрыйскае», праз якое праходзяць усе продажы на тэрыторыі Расіі. Гандлёвая сетка ў Беларусі прадстаўлена 25 крамамі.

Акрамя вытворчасці мясной прадукцыі, «Александрыйскае» мае пладовы сад агульнай плошчай 250 гектараў, фруктасховішча, якое часткова выкарыстоўваецца для вырошчвання вешанак. Гаспадарка развіваецца ў кірунку паглыбленай перапрацоўкі сваёй прадукцыі і пошуку рынкаў збыту. Са збытам, на жаль, ёсць складанасці.

## ВЁСКА БУДУЧЫНІ І ЗАКОН ДЛЯ ФЕРМЕРАЎ

Удзельнікі пасяджэння наведалі таксама «вёску будучыні» — гарадскі пасёлак Копысь Аршанскага раёна, прыклад таго, як павінна развівацца беларуская глыбінка.

— Гэта аддалены пасёлак, і такіх у нас вельмі шмат, — адзначыў Аляксандр Папкоў. — Калісьці яны былі буйнымі населенымі пунктамі, а зараз тут адчуваецца дэфіцыт працоўных месцаў, узнікаюць праблемы жыццезабеспячэння, добраўпарадкавання. Копысь узята за аснову — што павінна быць у маленькім населеным пункце, як вырашаць вышэйзначаныя праблемы. Калі гэтага не рабіць, людзі будуць кідаць вёску. Жыццё тут прыпыніцца. І гэта не самым лепшым чынам адаб'ецца на сельскай гаспадарцы.

Убачанае стала наглядным дапаможнікам пры падвядзенні вынікаў на пленарным пасяджэнні. Спецыялісты больш дэталёва абмеркавалі пытанні павышэння эфектыўнасці работы АПК, а таксама дзеянне закона «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы». «Гэты закон з некаторымі дапаўненнямі існуе ўжо каля 30 гадоў. Наколькі ён сёння актуальны? — пацікавіўся Аляксандр Папкоў. — Наша мэта — стварэнне фермерскай гаспадаркі, якая паспяхова і эфектыўна працуе». У фермераў была магчымасць падзяліцца меркаваннямі, выказаць свае заўвагі і прапановы, як гэта зрабіць.

— Праблема ў тым, што зямля не мае цаны і гэта прыводзіць да негатыўных наступстваў, — вылучыў адну з праблем **беларускі фермер Міхаіл ШРУБ.** — Асноўным падаткам у сельскай гаспадарцы павінна стаць арэндная плата за зямлю. Тады гэта заахвоціць тых, хто хоча яе ўзяць. А тыя, хто яе не апрацоўваюць, магчыма, падумаць, што яе лепш аддаць. І яшчэ. Фермер зможа закласці права арэнды, каб узяць фінансаванне. Калі так уцягнем зямлю ў абарот, мы падтрымаем многія пачынанні сялян, якія жадаюць працаваць. Класічныя фермерскія гаспадаркі, сямейныя прадпрыемствы здольныя закрываць такія праблемы, як вытворчасць агародніны, фруктаў, мясной прадукцыі невялікімі партыямі. Гэта дазволіць захаваць сельскі лад жыцця.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

❍ У тэму

**Алег ЧЫКІДА, першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама:**

— Міжрэгіянальнае і прыгранічнае супрацоўніцтва з'яўляецца адным з найбольш дзейсных і перспектыўных механізмаў пашырэння эканамічных кантактаў паміж Магілёўскай вобласцю і замежнымі рэгіёнамі. Магілёўскім аблвыканкамам падпісана каля 50 дакументаў аб супрацоўніцтве з рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі, краінамі СНД, блізкага і далёкага замежжа. Дагаворы датычацца ўзаемадзеяння ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай і культурнай сферах. Найбольш эфектыўна выконваюцца пагадненні, для рэалізацыі якіх заключаны дадаткова пратаколы (планы), якія змяшчаюць канкрэтныя мерапрыемствы па развіцці двухбаковых адносін. Ідзе цеснае супрацоўніцтва са Смаленскай, Бранскай, Белгародскай, Курскай, Арлоўскай, Разанскай абласцямі Расійскай Федэрацыі, Усходне-Казахстанскай вобласцю Казахстана і іншымі. Актыўна ажыццяўляецца тавараабарот з Масквой і Маскоўскай вобласцю, Санкт-Пецярбургам і Ленінградскай вобласцю, Ніжагародскай, Самарскай абласцямі.

Пятую частку экспарту (410 мільёнаў долараў ЗША) складаюць сельскагаспадарчая прадукцыя і прадукты харчавання. На экспарт ідзе 60 % атрыманай ялавічыны, 92 % сыроў, 66 % масла жывёльнага, 90 % сухіх малочных прадуктаў, 75 % жэлаціну.

НАПЯРЭДАДНІ

# Тысячы руж і не толькі

## Што новага з'явіцца ў Жодзіне да юбілею

**З кожным годам Жодзіна прыгажэе — гэта факт, які не аспрэчыш. Тут з'явілася шмат мясцін і аб'ектаў, якія сталі ўжо візітнай карткай, зрабілі горад адметным і пазнавальным. Сёлета 3 ліпеня Жодзіна адзначыць свой 55-гадовы юбілей не толькі значнымі мерапрыемствамі, але і новымі праектамі.**

Сярод іх стварэнне алеі крэатыўных лавак на праспекце Леніна, дзе свае тэматычныя кампазіцыі ўстановяць прадпрыемствы і арганізацыі горада. Напярэдадні свята вуліцы населенага пункта ўпрыгожаць тысячы руж, а балконы кватэр — дэкаратыўныя кветкі. Кожнае прадпрыемства і арганізацыя створаць сваю тэматычную клумбу.

Але, бадай, найбольшыя змены закранулі гарадскі парк культуры і адпачынку. Тут вядуцца маштабныя работы па добраўпарадкаванні, рэканструкцыі і будаўніцтве новых аб'ектаў.

Адразу кідаецца ў вочы шахматная пляцоўка, дзе будуць устаноўлены адпаведна ў рост чалавека шахматныя фігуры. Тут мы сустрэлі жыхара горада Яўгена Марцава з дачушкамі Ангелінай і Сафіяй.



Фасады дамоў радуюць вока рознакаляровымі пано.

Фота Анатоля БАСАВА.

— Сын Захар застаўся дома, — кажа шматдзетны бацька. — Мы часта з малымі гуляем у парку і бачым, як хутка ён мяняецца да лепшага. Нельга нават параўноўваць з тым, што было раней.

— Парк будзе раздзелены на зоны, дзе людзі любога ўзросту змогуць адпачыць з улікам сваіх інтарэсаў, густаў, прыхільнасцяў. У прыватнасці, дзіцячую пляцоўку з рамантычнай назвай «Акваторыя» аформяць у марской тэматыцы. Тут літаральна на вачах вырастае сапраўдная каравела, на якой прадугледжваецца штурвал, лесвіцы, масток, палуба, разнастайныя падвясныя ўстройствы для забаў малых. Вакол уладкуюць гумовае пакрыццё сіняга колеру. А ў асобным кутку парку плануецца яшчэ і вялікі карабель для дзяцей сярэдняга ўзросту.

Спартыўна-гульнявы комплекс уключыць у сябе пляцоўкі: пляжнага валейбола, стрытбола, трэнажорную — у тым ліку для дзяцей і дарослых, людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.

У турыстычнай зоне з'явяцца вяровачны гарадок, скаладром, скейт-парк. «Мы працуем з Федэрацыяй скейтбардыстаў, каб ён цалкам адпавядаў усім нарматыўным патрабаванням для правядзення спаборніцтваў рознага ўзроўню», — кажа **старшыня гарсавета Наталля СУШКО.**

Непадалёку ад лядовай пляцоўкі будзе ўладкавана экалагічная зона. Тут прадугледжаны два штучныя вадаёмы, злучаныя паміж сабой мастком з прыгожай ратондай. Сюды змогуць прыйсці закаханыя, маладажоны, маці з малымі, сталыя людзі... Пасядзець, палюбавацца воднай паверхняй, паслухаць плёскат вады.

У перспектыве ўпрыгожыць парк і музычна-светлавы фантан. Гэтую ініцыятыву падтрымала кіраўніцтва Беларускага аўтамабільнага завода. «Сёлета рыхтуецца праект, а ў наступным годзе спадзяёмся агульнымі намаганнямі яго рэалізаваць», — канстатуе Наталля Міхайлаўна.

Асноўныя работы плануецца выканаць да 3 ліпеня. На ўладкаванне парку пойдуць грошы ад суботнікаў. Грамадскасць таксама падключана да маштабных спраў. У фінансаванні прымаюць удзел прадпрымальнікі, кіраўнікі арганізацый і прадпрыемстваў горада.

Дадам, што ў горадзе працягваюць добраўпарадкоўваць двары, фарбаваць фасады дамоў, укладваць тратуарную плітку, асфальтаваць вуліцы. Акрамя таго, капітальным рамонтам ахоплены тры вялікія дваровыя тэрыторыі. Мы пабывалі ў адной з іх.

— Тут усе пытанні вырашаюць у комплексе: уладкоўваюцца ўваходныя групы, тратуары, стаянкі аўтатранспарту, дзіцячыя пляцоўкі з гумавым пакрыццём. Прычым месцы для забаў малых будуць знаходзіцца далей ад паркоўкі машын. Прадугледжана таксама вулічнае асвятленне і асфальтаванне, — расказаў **намеснік старшыні райвыканкама па жыллёва-камунальнай гаспадарцы і будаўніцтве Аляксандр ШЫЛА.**

Вядома, ажыццявіць усе грандыёзныя планы і задумы адначасова немагчыма. Для гэтага неабходны вялікія фінансавыя і матэрыяльныя ўкладанні. Работы па добраўпарадкаванні будуць працягвацца і пасля таго, як горад адсвяткуе юбілей.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Пакой для спакойнай старасці

**Жыхары Гомельшчыны пакуль толькі прыглядаюцца да новай формы сацыяльнай дапамогі пажылым людзям. Дарэчы, так званыя гасцявыя сем'і, якіх у вобласці налічылі 17, можна назваць цалкам валанцёрскай ініцыятывай. У зменах да закона «Аб сацыяльным абслугоўванні» афіцыйна замацаваны іншы тэрмін — «замяшчальная сям'я».**

У Петрыкаве пенсіянер Анатоль Берднік і яго грамадзянская жонка Людміла Ткачук даглядаюць 72-гадовую Кацярыну Карпухіну, інваліда другой групы. З мужчынам у тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва склалі адпаведны дагавор. Замацавалі дакументальна магчымасць карыстацца часткай пенсійных грошай пажылой жанчыны. Пры гэтым пільна сочаць за тым, каб яна была дагледжана. **Дырэктар мясцовага ТЦСАН Галіна СУХОЦКАЯ** гаворыць, што пасля аварыі, у якую трапіла адзінокая жанчына, ёй прапанавалі дом-інтэрнат, але яна туды не захацела ехаць:

— Кацярыне Міхайлаўне ў доме Анатоля Бердніка выдзелілі асобны пакой. Там умовы добрыя. Жанчыну даглядаюць і дапамагаюць ёй ва ўсім. Нашы інспектары часта наведваюць іх дом. Аказваем, калі трэба, дапамогу. Усё пад кантролем сацыяльных службаў. Бабуля наша чысценькая, акуратная, дагледжаная. Ні на што не скардзіцца.

— Мы прачыталі ў мясцовай газеце пра такую магчымасць — стаць замяшчальнай сям'ёй, — расказвае Людміла Ткачук. — Афармілі дагавор зусім нядаўна — некалькі месяцаў таму. Па дагаворы 70 % пенсіі Кацярына Міхайлаўна аддае ў сям'ю. Цяпер многія ў нас цікавяцца такой магчымасцю сацыяльнай дапамогі чалавеку, якому патрэбны догляд.

**Начальнік упраўлення сацыяльнай падтрымкі насельніцтва камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага аблвыканкама Галіна МАРОЗ** тлумачыць, што згодна са зменамі, унесенымі ў закон «Аб сацыяльным абслугоўванні», сацыяльным абслугоўваннем у замяшчальнай сям'і могуць скарыстацца непрацуючыя адзінокія інваліды I ці II групы або людзі, якія дасягнулі 70-гадовага ўзросту:

— Аказваць такую паслугу можа дзеяздольны грамадзянін ва ўзросце ад 18 да 65 гадоў (памочнік). Да таго ж мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі можа ўсталёўвацца памер штомесячнай грашовай узнагароды асобе, якая здзяйсняе абслугоўванне інваліда I групы з рэзка выяўленым парушэннем здольнасці да самаабслугоўвання, што пацвярджае адпаведнае медыцынскае заключэнне. Парадак і ўмовы замацоўваюцца дагаворам, дзе вызначаюцца месца пражывання непрацаздольнага грамадзяніна (гэта можа быць і яго дом, і дом памочніка), агульны бюджэт сям'і (пры гэтым у непрацаздольнага грамадзяніна павінна заставацца не менш за 25 % наяўных даходаў), а таксама тэрмін аказання сацыяльных паслуг (не менш за паўгода).

Галіна Мароз адзначае, што цяпер на Гомельшчыне вядзецца актыўная інфармацыйна-тлумачальная работа пра магчымасць новай сацыяльнай паслугі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ТЭРЫТОРЫЯ ДАПАМОГІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Здымак носіць ілюстрацыйны характар.*

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»).***

Наогул, Беларусь з поўным правам можна назваць урбанізаванай краінай. З амаль 9,5 млн насельніцтва — 7, 41 млн чалавек жывуць у гарадах, і толькі крыху больш за 2 млн — у вёсках. Але пры гэтым кожны трэці вясковец з'яўляецца пенсіянерам. У сталым узросце чалавек часта сутыкаецца з немаччу, калі ўсё цяжэй становіцца не тое што падтрымліваць звыклы лад жыцця — часцяком нават проста перасоўвацца. Такое ўжо наша жыццё: сталыя паступова становяцца ўсё больш залежнымі ад іншых — ад сваіх блізкіх, проста навакольных, ад соцыуму ў цэлым. Асабліва ў вёсцы, дзе, як правіла, у доме няма гарачай вады і гарачых батарэй зімой і да крамы не 200 метраў, як у горадзе, а пару кіламетраў, а то і значна больш. Калі ўлічыць, што большасць вясковых пенсіянераў, як і Вера Рыгораўна, жывуць адны, становіцца зразумелым, наколькі моцна маюць патрэбу яны ў дапамозе і сацыяльных паслугах, адказнасць за аказанне якіх кладзецца на мясцовыя органы ўлады і ўстановы сацыяльнай абароны насельніцтва.

## «КЛАСІКА ЖАНРУ»

На якую ж сацыяльную дапамогу ад дзяржавы могуць сёння разлічваць вясковыя пенсіянеры? Спецыялісты Міністэрства працы і сацабароны тлумачаць, што ў краіне функцыянуе 146 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва (ТЦСАН). У іх людзям аказваюць сацыяльныя паслугі, у тым ліку гаспадарча-бытавыя, пагадзіннага догляду (сядзелкі) за тымі, хто страціў здольнасць да самаабслугоўвання, паслугі цырульняў і іншыя.

**Але, як адзначаюць у Мінпрацы і сацыяльнай абароны, адным з самых запатрабаваных на сённяшні дзень відаў сацыяльных паслуг з'яўляюцца сацыяльна-бытавыя паслугі дома, якія аказваюцца амаль 90 тысячам чалавек — непрацаздольным пажылым людзям і інвалідам.**

У пералік гэтых паслуг уваходзіць набыццё і дастаўка прадуктаў харчавання, медыкаментаў і тавараў першай неабходнасці, дастаўка вады, дапамога ў растопцы печы, уборка жылых памяшканняў і іншае. І, дарэчы, амаль 65 % кліентаў, якія абслугоўваюцца дома — гэта сельскія жыхары.

Разам з тым заўважу, што ТЦСАН размешчаны ў райцэнтрах і абласных гарадах. А для забеспячэння даступнасці сацыяльнага абслугоўвання жыхароў вёскі арганізавана работа 1,2 тысячы сацыяльных пунктаў і 32 філіялаў цэнтраў.

Значнае распаўсюджванне ў сельскай мясцовасці атрымала аказанне паслуг праз комплексныя выязныя брыгады, якія ствараюцца рашэннямі райвыканкамаў. У склад брыгад уваходзяць спецыялісты розных службаў: арганізацый сацыяльнага абслугоўвання, аховы здароўя, прадпрыемстваў гандлю, бытавога абслугоўвання, культуры і іншых. Яны могуць аказваць разавыя паслугі па невялікай цане: рабіць апрацоўку прысядзібнага ўчастка, рамонт жылля, будынкаў, калоць дровы, рамантаваць печы, замяняць электраправодку. А яшчэ гэтыя службы арганізуюць выязныя прыёмы: сацработнікі кансультуюць жыхароў накont жыллёвых субсідый, ільгот, дапамог, выяўляюць сем'і «групы рызыкі», ажыццяўляюць сацыяльны патранаж. Акрамя таго, сумесна з сацыяльнымі работнікамі на вёсцы выяўляюцца і абмяркоўваюцца мясцовыя праблемы.

* * *

Такая дапамога запатрабаваная ў жыхароў аддаленых вёсак, якія складаюць амаль 10 % ад агульнай колькасці сельскага насельніцтва. Наогул, у аддаленых вёсках доля людзей старэйшых узростаў складае 80—90 %. Бо, як адзначаюць спецыялісты, працэс старэння насельніцтва ў сельскай мясцовасці ідзе больш хуткімі тэмпамі, чым у горадзе...

Калі пажылому вяскоўцу становіцца ўжо складана даглядаць сябе, ён можа звярнуцца ў аддзяленне круглasутачнага знаходжання. Такія аддзяленні створаны па ўсёй краіне, усяго іх на сённяшні дзень 62. У іх можна знаходзіцца на ўмовах аплаты або частковай аплаты, у залежнасці ад сітуацыі. Паводле звестак Мінпрацы, за 1-ы квартал 2018 года паслугамі аддзяленняў скарысталіся 2,1 тыс. чалавек. А калі пажылы чалавек ужо зусім не ў стане жыць адзін, ён трапляе ў дом-інтэрнат. Адзінокія пажылыя людзі, у якіх няма працаздольных дзяцей, абавязаных па закона іх утрымліваць, могуць пасяліцца ў доме-інтэрнаце на дзяржаўным забеспячэнні. Для тых, у каго ёсць працаздольныя дзеці, магчыма прызначэнне ў дом-інтэрнат на платнай аснове.

## ШТО СЯРОД НАВІНАК?

Мясцовымі органамі актыўна ўкараняюцца і новыя тэхналогіі сацыяльнай работы. Як правіла, новыя ідэі адпрацоўваюцца на пілотных праектах у раёнах і абласцях. Калі эксперымент аказваецца ўдалым, практыка прымянення той ці іншай паслугі распаўсюджваецца на ўсю краіну.

Напрыклад, «дамы зімоўкі». Гэта калі некалькі суседзяў зімой жывуць разам у адным з дамоў, і ім дапамагае сацыяльны работнік.

Адкрываюцца дамы самастойнага, сезоннага пражывання, у якіх пажылыя людзі жывуць працяглы тэрмін альбо толькі ў асенне-зімовы перыяд — самастойна арганізуюць сваё харчаванне і складваюцца на аплату камунальных паслуг. А ТЦСАН арганізуе сацыяльнае абслугоўванне сумесна пражываючых пажылых людзей.

**У апошнія гады сталі з'яўляцца і «прыёмныя сем'і» для грамадзян сталага веку — яны аб'ядноўваюць пад адным дахам сям'ю і пажылога чалавека, які мае патрэбу ў дапамозе. Трапляючы ў сям'ю, пажылы чалавек атрымлівае з боку «прыёмных дзяцей» увагу і клопат, і сам аказвае ім пасільную дапамогу па доглядзе за дзецьмі і вядзенні гаспадаркі.**

У 1-м квартале 2018 года, па звестках Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, у 39 дамах самастойнага (сумеснага) пражывання знаходзіліся 193 чалавекі, у трох дамах сезоннага пражывання і ў 306 дамах зімоўкі — 645 пажылых грамадзян, а таксама налічвалася 209 «прыёмных сем'яў».

* * *

— Летась была заканадаўча зацверджана яшчэ такая новая форма сацыяльнага абслугоўвання, як замяшчальная сям'я, — кажа **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Мінпрацы і сацыяльнай абароны Таццяна ФЁДАРАВА.** — Гэта калі чалавек ці сям'я афармляе догляд за непрацаздольным грамадзянінам пры ўмове сумеснага пражывання і вядзення агульнай гаспадаркі. Пры гэтым яны не павінны быць сваякамі. Працу па стварэнні замяшчальнай сям'і праводзіць Тэрытарыяльны цэнтр сацабслугоўвання: ён знаёміць памочніка (асобу, якая аказвае сацыяльныя паслугі ў форме сацыяльнага абслугоўвання ў замяшчальнай сям'і) і паўналетняга непрацаздольнага грамадзяніна, вызначае іх псіхалагічную сумяшчальнасць, арганізуе навучанне і падрыхтоўку памочніка. У першым квартале 2018 года ў краіне было створана шэсць замяшчальных сем'яў: пяць — у Мінскай вобласці і адна сям'я — у Гомельскай вобласці.

**Святлана БУСЬКО.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**о проведении 4 июля 2018 г. повторного аукциона по продаже изъятого по Указу Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 г. № 87 «О некоторых мерах по сокращению не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач» не завершенного строительством не законсервированного жилого дома и в частную собственность земельный участок, на котором расположен предмет аукциона в Радваничском сельском Совете Брестского района**

| № лота | Местоположение незавершенного строительством незаконсервированного жилого дома | Характеристика объекта оценки | Площадь земельного участка, га | Начальная (стартовая) стоимость объекта (бел. руб.) | Сумма задатка, бел. руб. | Возмещение расходов |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Брестский район, д. Малые Радваничи, ул. Вересовая, д. 8 | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом в виде капитального строения (фундамента) наружной площадью – 82 кв. м, готовностью основного строения 4%, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 121283701101000279 | 0,1855 | 8240,00 | 824,00 | 1. Государственная регистрация прекращения права собственности на земельный участок – 73,50 руб. 2. Объявления – согласно актам выполненных работ |

Имеется возможность электрификации, газификации.

Аукцион будет проводиться 4 июля 2018 г. в 11.00 по адресу: Брестский район, аг. Большие Радваничи, ул. Центральная, 94 (в здании сельисполкома).

Для участия в аукционе необходимо подать заявление и предоставить копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Радваничского сельисполкома (BY61AKBB36410000002621000000, БИК AKBBBY21100 ф-л № 100 ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 200036035, код платежа 4901) суммы задатка в размере 10 % от начальной цены земельного участка, а также документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Для проведения аукциона необходимо наличие не менее 2 участников. Если аукцион признан несостоявшимся из-за того, что заявление на участие в нем подано только одним гражданином, земельный участок предоставляется этому гражданину при его согласии с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем аукциона либо единственным участником аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: Брестский район, аг. Большие Радваничи, ул. Центральная, 94 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявления – 27 июня 2018 г. до 17.00. Дополнительную информацию о земельном участке можно получить по телефонам: 93 11 35, 93 11 36, 93 11 30, 93 16 11.

■ За кадрам

# «НЕ ВЕДАЮ, ХТО ГЭТА, АЛЕ Ж ДОБРА СПЯВАЕ!»




Сёлета гэта самае папулярнае месца для сэлфі ў Наваполацку.

## У Наваполацку ўпершыню прайшоў канцэрт «Песня года»

**Музычны тэлепраект «Песня года» тэлеканал АНТ ладзіць ужо 13 гадоў, пераняўшы традыцыю ў расійскага Першага канала. Але выязджаць з канцэртамі за межы сталіцы, бліжэй да слухачоў, пачалі адносна нядаўна: так, летась праект адбыўся ў Маладзечне, а гэтым летам завітаў на Віцебшчыну — у Наваполацк. Як кажуць самі тэлевізійнікі, проста ўсё супала: і Год малой радзімы, і 60-гадовы юбілей аднаго з самых маладых беларускіх гарадоў, і тое, што менавіта Наваполацк сёлета з'яўляецца культурнай сталіцай краіны. Як горад-юбіляр сустрэў папулярных і малавядомых беларускіх артыстаў і якія ўражанні засталіся ў тых ад мясцовай публікі — у рэпартажы «Звязды» з месца падзей.**

...Адкрытая канцэртная пляцоўка на плошчы Будаўнікоў перад Наваполацкім гарвыканкамам да прыёму ўдзельнікаў ужо практычна гатовая: сцэна змантаравана, месцы для тэлекамер вызначаны і 20 радоў рознакаляровых крэслаў чакаюць публіку, якая падцягваецца з першымі музычнымі акордамі рэпетыцыі, хоць да самога канцэрта яшчэ... дзевяць гадзін!



Папулярны відэаблогер Лера ЯСКЕВІЧ не адмовіла прыхільнікам у абдымках і сумесных фота, а ўвечары адкрыла канцэрт з чуллівай песняй на верш Ніла Гілевіча.

## Хто на новенькага?

Пакуль рэжысёр і здымачная група ўзгадняюць нюансы кожнага нумара з артыстамі, я разжываюся спісам удзельнікаў канцэрта. У «Песні года», акрамя загадзя заяўленых хэдлайнераў ды вопытных байцоў музычнага фронту — Ядвігі Паплаўскай, Анатоля Ярмоленкі, Іны Афанасьевай, Аляксея Хлястова, Вікторыі Алешкі ды іншых, — даволі многа і новых імёнаў. Тлумачыцца гэта проста: упершыню арганізатары ўлічвалі не толькі паўгадавыя ратацыі на вядучых радыёстанцыях, але і папулярнасць музычных кампазіцый і відэакліпаў на YouTube і ў сацыяльных сетках. Такім чынам у канцэрт трапілі, напрыклад, Лера Яскевіч і Юлія Гадунова, якія ўваходзяць у лік самых папулярных беларускіх блогераў. Аўдыторыя падпісчыкаў у кожнай з дзяўчат перавышае 400 тысяч чалавек, а прагляды відэаблогаў вымяраюцца мільёнамі. Аднак людзям, далёкім ад інтэрнэту, ідэнтыфікаваць новых герояў маладога пакалення складана, таму падчас рэпетыцыі не раз і не два давялося пачуць сакраментальнае «А хто гэта?!» і заўважыць крыху паблажлівыя позіркі ў бок дзяўчат. Праўда, позіркі хутка змяніліся на зацікаўленыя, калі некалькі дзясяткаў падлеткаў пабеглі да куміраў, каб пазнаёміцца жыўцом, сфатаграфавацца і папрасіць аўтограф.

Ураджэнка Віцебшчыны Лера Яскевіч (дзяўчына нарадзілася ў г. п. Багушэўск, але апошнія некалькі гадоў жыве ў Мінску) праславілася тым, што надзвычай пранікнёна выконвае пад гітару каверверсіі вядомых хітоў — рускіх і англамоўных. А яшчэ на пачатку гэтага года Лера стала голасам прыгожага і кранальнага роліка — відэакліп «Калі рана ўстанеш» на верш Ніла Гілевіча зняў тэлеканал АНТ да Года малой радзімы. «Добра памятаю, як гэта было, — дзеліцца Лера, — на канале шукалі новага артыста для запісу відэароліка, і праз майго менеджара выйшлі на мяне. Прапанова падалася цікавай — і канцэпцыя кліпа, і верш Ніла Гілевіча. Да майго сораму, раней я гэты твор не ведала, але так яго ўпадабала, што тут жа запісала песню, і яе пусцілі ў эфір...»



Ганна ШАРКУНОВА і саліст гурта «Без білета» Віталь АРТЫСТ за некалькі хвілін разварушылі залу.

19-гадовая Юля Гадунова — ураджэнка Ельска, якая таксама цяпер жыве і вучыцца ў Мінску, а паралельна запісвае відэа «пра жыццё тыповага студэнта» і займаецца вакалам. Наколькі ўдала? На хвіліначку, кліп на песню «Давай застанёмся» за тры месяцы ў сецыве назбіраў звыш 374 тысяч праглядаў. Ну, а на «Песні года» прыхільнікі масава здымалі Юлю, а сама яна пасля выступлення заявіла, што не можа не скарыстацца момантам, і запісала на камеру тэлефона сэлфі проста са сцэны. «Я дагэтуль не веру, што стаю на сцэне, эмоцыі проста неверагодныя. Глядзіце мяне па тэлевізары!» — заклікала дзяўчына, і гэты яе відэазварот у Інстаграме, дарэчы, паглядзела ўжо больш за 100 тысяч чалавек. Многія, зрэшты, засталіся пакрыўджаныя на тое, што кумір так і не падышла да іх перакінуцца хоць парай слоў.

## Для сваіх. На сваёй

Яшчэ адно маладое, але ўжо вядомае імя — Руслан Асланаў. Звязаць у свядомасці гэтага высокага юнака ў дызайнерскай вышыванцы, які выконвае модную апрацоўку беларускай народнай песні, з прадстаўніком Беларусі на дзіцячым «Еўрабачанні» 2015 года ўдаецца не адразу.

— Пасля «Еўрабачання», дзіцячай «Новай хвалі», украінскага «Голас. Дзеці» так прыемна, што вы зноў на беларускай сцэне і з беларускай песняй.

— Ну, а як інакш, — пацiскае плячыма Руслан, — калі ты жывеш у Беларусі, то, на мой погляд, мусіш ведаць і шанаваць і мову, і музыку, тое, што пераходзіць да нас ад мінулых пакаленняў. — Мне вельмі спадабалася хіп-хоп-апрацоўка, якую зрабіў для народнай песні «З таго боку возера» Кірыл Ермакоў, на мой погляд, атрымалася класна — і, спадзяюся, не апошні раз.

«Вы, часам, не ведаеце, хто гэта? Такія драйвовыя, так добра спяваюць!» — сарамліва пытаюцца дзяўчаты, якія здымаюць на тэлефоны выступленне магілёўскага рок-гурта Nizkiz. Хлопцы са сваім хітом «Небяспечна» сапраўды вылучаюцца на агульным эстрадным фоне. «Шкада, што вы, як і іншыя беларускамоўныя выканаўцы, тут у меншасці», — заўважаю я. «Галоўнае, што не ў сексуальнай! — рагочуць музыканты. Але адразу робяцца сур'ёзныя. — Калі мы трапілі ў «Песню года», значыць, людзі беларускую музыку слухаюць і ім падабаецца, а далей справа за намі, каб не расчараваць».

У невялікі беларускамоўны блок (6 песень з 32 удзельнікаў канцэрта) таксама ўвайшлі маладая, але ўжо загартаваная сцэнай спявачка Ніна Жукоўская, якая апошнія некалькі гадоў актыўна набіраецца конкурснага вопыту, электронны праект з Гродна Mikita і гурт «Аўра». Салістка апошняга Юлія Быкава ў творчым тандэме з мужам, кампазітарам Яўгенам Алейнікам, стала лідарам «Песні года» па колькасці песень-удзельніц. «Праўда, чатыры нашы песні будуць? — крыху недаверліва ўдакладняе Юлія. — Ну ўсё, аўтарскае шчасце маё сёння бязмежнае! 2018-ы для нас наогул праходзіць нябдага: зладзілі да свайго 15-годдзя вялікі сольны канцэрт у Купалаўскім тэатры, прэзентавалі некалькі песень да Года малой радзімы. Проста рукі да ўсяго не даходзяць, шчыра кажучы, інакш рабілі б нашмат больш».

...Бліжэй да вечара публіка падцягвалася на плошчу ўсё больш актыўна і здалёк пазнавала любімых артыстаў: «Глядзі, Афанасьева якая стыльная!». Выканаўцы, у сваю чаргу, раздавалі звыклыя кампліменты гораду



А 9-й вечара на пляцоўцы яблыку не было дзе ўпасці, а тыя, каму не хапіла запрашальнікаў, зладзілі танцы за агароджай.

і мясцовым слухачам. Зрэшты, частка прызнанняў мае пад сабой пэўныя падставы. Так, саліст гурта Mikita успомніў, што першы кліп здымаўся летась «тут недалёка», на фоне маляўнічых краявідаў пад Браславам, таму і навапалачане яму ўжо не чужыя.

## Сцэна на дваіх

У «Песні года» заяўлены 32 удзельнікі, але насамрэч артыстаў больш — у праграме нямала дуэтаў. Сумесныя работы прадставілі хэдлайнеры канцэрта — расійскі спявак і кампазітар Глеб Мацвяйчук і заслужаная артыстка Беларусі Алёна Ланская, беларусы з армянскімі каранямі Іскуі Абалян і Егіазар Фарашан, Галіна Шышкова і Алеся Баярскіх, Алена Грышанава і праект Jackpot, Вольга Рыжыкава і Тэа... Але, бадай, самым нечаканым стаў дуэт Ані Шаркуновай і гурта «Без білета». Ганна, якую мы прызвычаіліся бачыць у канцэртных сукенках і на абцасах, цяпер выйшла на сцэну ў красоўках і джынсавай спадніцы і разам з Віталем Артыстам кіравала залай: «Дапамажыце нам, калі ласка, — падчас прыпеву машыце рукамі вось так». Як прызналася ў закуліссі спявачка, для яе гэта работа стала самай імклівай у жыцці:

— 4 чэрвеня ў нас была нарада па песні, а праз дзень гурт даваў сольны канцэрт, і я перажывала, што мы нічога не паспеем. Але ўсё атрымалася літаральна за тры дні, і вынік асабіста мне вельмі падабаецца.

— Аня, вы ж маладая мама, — як усё паспяваеце?

— Нічога не паспяваю, — смяецца артыстка. — 14 чэрвеня дзіцяці ўжо годзік, яно пачало хадзіць, а я дагэтуль не магу звыкнуцца, якім імклівым стала жыццё і як па-іншаму ацэньваеш час, які хочацца выкраіць і на блізкіх, і на творчасць, і на стасункі з сябрамі.

Пра хуткаплыннасць часу разважаў таксама кіраўнік і саліст «Сяброў» Анатоль Ярмоленка, які гэтым вечарам выканаў песню «Добрыя людзі» разам... з Анатолем Ярмоленкам. Малодшым. «Я памятаю, як праходзіла першая беларуская «Песня года», і вельмі прыемна, што цяпер традыцыю падхапілі і адзін з самых маладых гарадоў нашай краіны, і новыя маладыя выканаўцы, — адзначыў Ярмоленка-старэйшы. — Рады, што Анатоль выпусціў свой альбом і прадстаўляе песні з яго на канцэртах «Сяброў». Яму не трэба падказваць штосьці ў музычным сэнсе, хутчэй, трэба не перашкаджаць і назіраць, які атрымліваецца ф'южн з сучасных рытмаў і традыцый нашага пакалення».

Уласна, такім змяшэннем стыляў і пакаленняў атрымалася і летняя «Песня года — 2018». Ацаніць яе на ўласныя вочы і вушы можна будзе 24 чэрвеня на тэлеканале АНТ.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

*Мінск — Наваполацк — Мінск.*

**Больш фота глядзіце на сайце zviazda.by.**


**Рыхтуй бочкі летам! Са «Звяздой»!**

**13 ліпеня сярод сваіх падпісчыкаў на трэці квартал або другое паўгоддзе «Звязда» разыграе сем дубовых бочак ёмістасцю 10 літраў і адну (суперпрыз) — ёмістасцю 30!**

**Не забудзьцеся запоўніць купон *(глядзі справа)*, выразаць яго і да 11 ліпеня даслаць у рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а. А ўжо далей...**

**Вам пашанцуе!**



***Падрабязныя правілы гульні змешчаны ў нумары за 31 мая. Тэрміны правядзення гульні — з 01.06.2018 да 30.09.2018.***

***Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3284 ад 25.05.2018 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.***

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2018 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______________________

______________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ______________________
(аддзяленне сувязі)

на III квартал або II паўгоддзе 2018 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) ________ (індэкс) ________

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!

# Людзі звонку і знутры

**«ПАКАЁЎКА»**
**«БЕЛАРУСЬ 1», З 19 ЧЭРВЕНЯ**



**2.55** Голыя і напалоханыя (16+).

# ЯК ДОМА...

**Як старшыня Лапаціцкага сельскага Савета дэпутатаў разам з сацыяльнымі работнікамі стварыў умовы для адзінокіх састарэлых жыхароў Слаўгарадскага раёна**

**Сцяпан Байцоў — чалавек на сваім месцы. Ну не любіць ён, калі нешта робіцца не па-гаспадарску. Адным з першых у раёне стаў працаваць з міжнароднай дапамогай. Першыя праекты рэалізоўваў у Лясной. Жыхары вырошчвалі экалагічна чыстую прадукцыю на забруджаных пасля чарнобыльскай аварыі тэрыторыях. Ад бульбы і буракоў паступова перайшлі да жывёлы. Быў час, калі актыўны старшыня збавіў абароты, але зараз ён зноў увесь у праектнай дзейнасці. Дом сезоннага знаходжання для пажылых грамадзян у Лапацічах створаны менавіта па яго ініцыятыве. Гэтак ён разам з сацыяльнымі работнікамі вырашыў лёс пустуючага будынка і адначасова пакінутых у адзіноце землякоў.**



Сцяпан БАЙЦОЎ — чалавек справы.

— Ідэя нарадзілася сама сабой, — расказвае Сцяпан Байцоў. — У нас быў цэнтр вольнага часу, дзе збіраліся пенсіянеры. Потым разыходзіліся па дамах. І ў мяне ўзнікла думка — стварыць для іх дом. Зімой на сацыяльныя ложкі ў бальніцу іх неахвотна прымаюць. А тут падвярнулася магчымасць напісаць адпаведны праект. Сказана — зроблена. І праект перамог. Калгас даў паўразбураны дом, дапамог з будаўнічымі матэрыяламі. За грошы міжнароднай дапамогі перарабілі паравое ацяпленне, зрабілі рамонт, набылі шклопакеты, дзверы, ложкі, пральную машыну, тэлевізар. І — адкрыліся. Ахвотных там пажыць хапае. Паслугамі карыстаюцца жыхары з усяго раёна. А жанчыне з Прудка наогул у Лапацічах так спадабалася, што яна стала думаць пра тое, каб купіць сабе тут дом.

Лапацічы — аграгарадок сярэдніх памераў, тут жыве 500 чалавек. Але насельніцтва руплівае, трымае 54 каровы. Тэрыторыя дагледжаная, амаль няма закінутых хат. Дом сезоннага знаходжання выглядае дыхтоўна, вакол шмат дрэў, птушкі спяваюць.

Летам жыццё ў гэтым будынку крыху запавольваецца, але некаторыя жыхары знаходзяцца тут круглы год. Як, напрыклад, Уладзімір Нікіценка. Калі мы пад'ехалі, ён якраз на лаўцы каля дома сядзеў — дыхаў свежым паветрам. На гук машыны выйшла сацыяльны работнік Любоў Куляшова. «Вось, часова падмяняю нашу работніцу», — усміхаецца яна і запрашае ў дом. На кухні пахне баршчом. На стале — дзве міскі з апетытным варывам, рыба і чай. Вітаемся з яшчэ адным пастаяльцам. Віктар Мізгайла, нягледзячы на свае 88 гадоў, выглядае бадзёра і дзелавіта цікавіцца: «Вы з райвыканкама?» Ён сам там працаваў 26 гадоў на розных пасадах і вельмі ганарыцца, што мае званне ветэрана працы.

У «прытулку» Віктар Іванавіч жыве ўжо другі год. Дачка з сынам у Санкт-Пецярбургу, абое атрымалі вышэйшую адукацыю. «Неяк тэлефанавала Люба, сказала: «Тата...» — мужчына збіваецца на слёзы. На маё пытанне: ці даўно прыязджалі? — адказвае: «Маці хаваў без іх». Яна, дарэчы, памерла 15 гадоў таму. «Зусім не прыязджаюць», — уздыхае Любоў Куляшова.



Разам не так сумна.

— А як дзень праходзіць? — спрабую крыху згладзіць няёмкі момант.

— Ды вось, хаджу па вуліцы, наведваю краму, з суседзямі сустракаюся.

Да паслуг пажылых некалькі спальных пакояў, зала, кухня, санвузел. Умовы — лепей не прыдумаеш. Не трэба клапаціцца пра тое, каб нешта з адзення памыць або ежу для сябе прыгатаваць. Для гэтага тут ёсць сацыяльны работнік. За пражыванне з пастаяльцаў грошай не бяруць, яны плацяць толькі за ежу і камунальныя паслугі. Летам за газ і святло набягае рублёў 20, зімой — да 70. Але зімой і народу тут пабольш, так што для кожнага асобна атрымліваецца не вельмі адчувальна.

Віктар Іванавіч паказвае пакой, які ён дзеліць з «напарнікам». Сціпла, але ўсё, што трэба для жыцця, ёсць: ложкі, шафа, крэсла. На сценах вясёлага колеру шпалеры, на вокнах шклопакеты.



Сацработнік Любоў КУЛЯШОВА даглядае пастаяльцаў.

Гасцёўня выглядае нават раскошна. Шырокая канапа, тэлевізар, крэсла, шафа. Што яшчэ трэба? Мужчыны прызнаюцца, што ім тут вельмі падабаецца. Зімой людзей пабольш, але і ўдваіх някепска. Уладзімір Нікіценка таксама са Слаўгарада. У яго там ужо нікога з блізкіх не засталося. У Магілёве жыве сястра, але яна не прыязджае. Дзяцей няма, жонка памерла.

Дзеці — гэта асобная размова. «Адзін дзядуля жыў у Пацяраеўцы, потым аслеп. Адшукаў яго дачку, паведаміў, а яна ў адказ — грошай прыехаць няма, — абураецца Сцяпан Байцоў. — Не знайшлося іх у яе і калі бацька памёр, хавалі за кошт сельвыканкама. Але дачка нават на магілу не прыехала. Дом стаіць пусты, таксама нікому не патрэбны...»

Зараз у старшыні задача № 1 рэалізаваць яшчэ адзін сацыяльны праект. Называецца ён «Зялёны яр». «Ёсць у нас тут роў, па якім ручай працякае. Месца прыгожае, але шмат старых дрэў трэба знесці, запруду зрабіць, гульнявыя пляцоўкі. На ўсё гэта не хапае грошай. А вось міжнародная тэхнічная дапамога была б дарэчы. Атрымалі б цудоўнае месца для адпачынку дарослых і дзяцей», — кажа ён. Магчыма, і гэтая мара некалі спраўдзіцца...

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

МЕРКАВАННІ

# АБАВЯЗАК КЛАПАЦІЦЦА

**Адзін з прыярытэтаў сацыяльна арыентаванай дзяржавы — клопат пра старэйшае пакаленне. Дагледзець сваіх нямоглых блізкіх у першую чаргу павінны дзеці і родныя. Але жыццёвыя абставіны бываюць розныя, і часам пажылыя людзі сустракаюць старасць у адзіноце. Тады абавязак дапамагчы ўскладваецца на тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Мы запыталі ў нашых чытачоў, ці запатрабавана дапамога сацыяльных устаноў і як суадносіцца яна з патрэбамі пажылых грамадзян.**

**Васіль ЗАХАРЭНКА, старшыня Клімавіцкага раённага Савета дэпутатаў:**

— Сістэма сацыяльнага абслугоўвання пажылога насельніцтва створана і адпрацавана даўно. Я не бачу вялікіх недахопаў у яе функцыянаванні. Яна прадстаўлена тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання. У рэгіёнах, дзе дазваляюць сродкі і магчымасці, працуюць фельчарска-акушэрскія пункты. Яны аказваюць тэрміновую дапамогу пры неабходнасці.

Для абслугоўвання адзінокіх састарэлых жыхароў наймаюць сацыяльных работнікаў. Гэта асабліва актуальна для вясковай мясцовасці, таму што там цяжэй жыць старым. Як правіла, сацработнікі пражываюць па суседстве з чалавекам, якому неабходны догляд.

Калі пажылы чалавек жадае атрымаць дапамогу, ён павінен звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання. Але тут трэба падкрэсліць, што ўсе састарэлыя адзінокія людзі стаяць на ўліку ў сельвыканкаме. Часам мы самастойна прывозім заявы ў цэнтры ад хворых, нямоглых грамадзян. Многія старыя людзі не ведаюць пра магчымасці дапамогі ад сацыяльных службаў і могуць не звярнуцца ў час рэальнай неабходнасці.

Для пажылых людзей, якія і да такіх умоў не могуць прыстасавацца, створаны дамы, дзе яны пражываюць у стацыянары.

**Віктар КОСТКА, першы намеснік старшыні савета Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў:**

— Наша арганізацыя працуе ў сувязі з органамі сацыяльнай абароны і тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання. Ветэраны атрымліваюць ад іх не толькі неабходную дапамогу, але і займаюцца ў гуртках па інтарэсах. Кожны з раённых цэнтраў мае свае цікавыя ініцыятывы. Скаргаў на сацыяльныя цэнтры з боку ветэранаў няма. Установы вырашаюць усе пытанні, якія ўскладзены на іх згодна з заканадаўствам. Многіх нашых ветэранаў дагледжваюць родныя, але, калі ўзнікае неабходнасць, мы звяртаемся да сацыяльных службаў.

Найбольш запатрабавана насельніцтвам паслуга аказання дапамогі хворым, адзінокім ветэранам дома. Тэрытарыяльны цэнтр накіроўвае свайго супрацоўніка да грамадзяніна, які не можа абслугоўваць сябе самастойна. І гэты сацыяльны работнік згодна з графікам наведвае падапечнага, гутарыць з ім, ходзіць у магазін. Падчас выбараў сацыяльныя службы з камісіямі забяспечваюць ветэранам магчымасць прагаласаваць дома.

Для адзінокіх людзей важная не толькі дапамога, але і магчымасць камунікацыі, адчуванне, што пра цябе памятаюць. Напрыклад, нядаўна жыхару Кастрычніцкага раёна Мінска, удзельніку вайны, споўнілася 100 гадоў. Наша арганізацыя сумесна з БРСМ, упраўленнем сацыяльнай абароны віншавала яго.

**Святлана ЦІШКЕВІЧ, дырэктар Наваполацкага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва:**

— У склад нашага цэнтра ўваходзяць сацыяльны пункт і 7 аддзяленняў, якія аказваюць разнастайны спектр сацыяльных паслуг. На тэрыторыі Наваполацка пражывае фактычна 21 тысяча чалавек пажылога і састарэлага ўзросту. Штогод спецыялістамі арганізацыі праводзяцца абследаванні матэрыяльна-бытавых умоў жылля пажылых грамадзян, ветэранаў вайны — для выяўлення і ўліку патрэб у розных відах дапамогі.

Адна з прыярытэтных і запатрабаваных формаў сацыяльнага абслугоўвання — работа аддзялення сацыяльнай дапамогі дома. У складзе аддзялення працуюць 48 сацыяльных работнікаў. Цяпер на надомным абслугоўванні знаходзяцца 482 адзінокія і адзінока пражываючыя пажылыя грамадзяніны.

Найбольш запатрабаваныя з пераліку бясплатных і агульнадаступных паслуг — гэта купля і дастаўка дадому прадуктаў харчавання, прамысловых тавараў першай неабходнасці, унясенне платы за камунальныя паслугі, вільготная прыборка падлогі, вынас смецця, дастаўка лекаў.

Вялікай папулярнасцю карыстаецца група «Пенсіянер-валанцёр: я чалавек вольны, мне нескладана дапамагчы». Пажылыя валанцёры не замяняюць сацыяльных работнікаў. Яны, хутчэй, сябры-равеснікі і псіхолагі ў адной асобе. Для эфектыўнасці сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ў цэнтры ўкаранёныя інавацыйныя формы работы з пажылымі грамадзянамі — «Брыгада экстраннага рэагавання» для вырашэння праблем адзінокіх пажылых людзей, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, «Школа бяспекі для пажылых людзей і інвалідаў», «Школа рэабілітацыі і догляду» ў дапамогу сваякам пажылых грамадзян, якія страцілі здольнасць да самаабслугоўвання. З'явілася новая паслуга «Skype-кансультаванне». Маламабільныя пажылыя грамадзяне і члены іх сем'яў могуць атрымаць кваліфікаваную дапамогу, не выходзячы з дому.

Працуе ў аддзяленнях і 11 гурткоў: замежных моў, прававых ведаў, фізкультурна-аздараўленчай, дэкаратыўна-прыкладной накіраванасці, гурток па іпатэрапіі. Некаторыя з іх вядуць валанцёры-студэнты Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**Марыя ДАДАЛКА.**

А ВЫ МОЖАЦЕ?

# У 90 ГАДОЎ... НА ВЕЛАСІПЕД

**У Сенненскім раёне бабулі і дзядулі катаюцца на веласіпедах, ходзяць у пешыя паходы, удзельнічаюць у народных гульнях, якія вывучаюць падчас этнаграфічных экспедыцый. А ў пытаннях экалогіі супрацоўнічаюць нават з Акадэміяй навук.**



**Клара Аляксандраўна ПЕРАПЕЧЫНА (злева) і дырэктар Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Сенненскага раёна Тамара СМІРНОВА.**

## Вырашылі па-добраму страсянуць

Пасёлак Багушэўск, дзе я і пазнаёміўся з цікавымі людзьмі, знаходзіцца паміж Віцебскам і Оршай. Там жывуць каля 2,5 тысячы чалавек. Яшчэ на вакзале адчуў, што Багушэўск нейкім чынам нагадвае гарадок з фільма «Безымянная зорка». І тут, бадай, таксама ўсе ведаюць адно аднаго. Гэткае правінцыйнае ціхае жыццё...

А памыліўся ж! Усё самае перадавое і цікавае ў пасёлку адбываецца ў грамадскім жыцці — дзякуючы крэатыўным супрацоўнікам сістэмы сацыяльнай абароны. Яны ж сталі ініцыятарамі рэалізацыі праекта «Разам да здароўя». Выйгралі грант у рамках адпаведнай прапановы Чырвонага Крыжа.

— Усё пачалося з ідэі па прасоўванні здаровага ладу жыцця... Мы ўзвалілі на сябе велізарную адказнасць: «ажывіць» наш Багушэўск. І пачалі з сябе. У большасці хвароб вінаватыя не прырода, не грамадства, а сам чалавек. Часцей за ўсё ён хварэе ад ляноты, прагнасці і неразумнасці. Пры стварэнні ініцыятыўнай групы кожны з нас меў свой багаж нездаровых звычак, якім мы далі бой, — расказвае **Галіна СЕКАЧОВА, загадчык аддзялення сацыяльнай адаптацыі, рэабілітацыі і суправаджальнага пражывання Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Сенненскага раёна, лідар ініцыятыўнай групы.**

Цікава, што група, калі пісаць па-руску, мае назву «БАКС». А ў перакладзе на беларускую мову, абрэвіятура расшыфроўваецца так: «будзем актыўнымі, прыгожымі, стройнымі».

Паглядзеў «справаздачу» групы аб поспехах. Дарэчы, зроблена не без гумару. Галіна і аднадумцы на фота на фоне рысак для вымярэння росту з таблiцамі ў руках. На іх надпісы з праблемамі здароўя, якія былі раней. Галіна не ўтойвае, што ёй пад 60. Як і тое, што кожны дзень піла таблеткі, каб нармалізаваць ціск, вяла малярухомы лад жыцця, харчавалася няправільна. Цяпер адчувае сабе, як той сказаў, на 5 балаў.

## І знялі... групу інваліднасці!

Багушэўск цяпер без перабольшання можна назваць адным з лідараў сярод невялікіх населеных пунктаў Віцебшчыны ў пытанні перасоўвання на веласіпедах.

Што цікава, «колы» (усяго іх каля 20) выдаюць напракат бясплатна, нават прыезджым. Ёсць яны і для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, і дзіцячыя, асобна — для жанчын і мужчын. Маё прызнанне наконт таго, што апошні раз катаўся гадоў 30 таму, выклікала абурэнне. Адразу захацелі навучыць.

Ёсць сярод аматараў «веліка» і 80—90-гадовыя. Ды не проста праязджаюць пару вуліц, а разам кіруюць у паходы. Адпаведна, самы працяглы маршрут даўжынёй каля 8 кіламетраў. А калі не сезон, ахвотным выдаюць палкі для скандынаўскай хады. Хаця імі скарыстацца можна і ў іншыя поры года.

Катанне, здаровы лад жыцця робяць цуды. Напрыклад, у аднаго з удзельнікаў, валанцёра, групу інваліднасці знялі. Другі кінуў піць без дапамогі нарколага.

Валанцёры аказваюць бясплатна і шэраг іншых паслуг. Напрыклад, займаюцца распілоўкай дроў, калі трэба — пакосяць. Ёсць матаблок, з дапамогай якога можна араць. Печку адрамантаваць таксама могуць.

Не раз дзейнасць валанцёраў і ў цэлым сацыяльных работнікаў адзначалі нават не на рэспубліканскім, а на міжнародным узроўні. У прыватнасці, шмат цёплых слоў выказалі кіраўнікі Чырвонага Крыжа з Швейцарыі, якія прыязджалі ў Багушэўск.




**Мясцовыя веласіпедысткі.**

## Санаторый... дамашні

Актыўна пенсіянеркі з глыбінкі карыстаюцца паслугай «Санаторый дома».

— Паслуга аказваецца ветэранам Вялікай Айчыннай, грамадзянам, якія пацярпелі ад наступстваў войнаў, адзінокім пажылога ўзросту, — удакладняе **дырэктар Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Сенненскага раёна Тамара СМІРНОВА.**

Выяўленне кліентаў, якія маюць патрэбу ў паслузе, робіцца спецыялістамі цэнтра пры цесным узаемадзеянні з медыкамі. Участковым тэрапеўтам па выніках агляду складаецца індывідуальны план аздараўлення. Паралельна прызначаецца медыкаментознае лячэнне і даюцца медыцынскія рэкамендацыі.



**Галіна СЕКАЧОВА паказвае карту з выявай веламаршруту.**

А комплексная паслуга «Санаторый дома» аказваецца рознымі аддзяленнямі цэнтра. У прыватнасці, аддзяленнямі сацыяльнай дапамогі дома, дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту, сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі, суправаджальнага пражывання.

Сацыяльныя работнікі прыносяць прадукты харчавання, лекі. Пры неабходнасці прыгатуюць простыя дыетычныя стравы. Па прызначэнні ўрача прыгатуюць фіта-чаі і пракантралююць прыём лекаў.

А з удзелам валанцёраў аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту можа быць арганізаваны вольны час. Прапануюць наступныя паслугі: «Суразмоўнік на гадзіну», мініканцэрт, бібліятэрапія (чытанне кніг), музычная тэрапія (спяванне песень). Псіхолаг аддзялення сацыяльнай адаптацыі, рэабілітацыі і суправаджальнага пражывання таксама аказвае падтрымку. Плюс праводзяцца мерапрыемствы па паляпшэнні ўвагі і памяці. Сярод іншага практыкуюцца галатэрапія (лячэнне штучным сонцам), магнітатэрапія, самамасаж і іншае.

## «Вам 90?!!»

Сёння такімі паслугамі пажадалі скарыстацца чацвёра грамадзян. Адна з іх — **Клара Аляксандраўна Перапечына.** Калі б мае спадарожніцы не сказалі, што пенсіянерцы за 90, ніколі не падумаў бы.

На ўсякі выпадак паўтарыў пытанне, звяртаючыся да бабулі. А яна развесялілася, расказаўшы, як у Віцебскім абласным дыягнастычным цэнтры ўрач вырашыў, што ў накіраванні памылка наконт узросту пацыенткі.

— А я яму: не, чалавек дарагі, усё правільна напісалі! Дык ён калег паклікаў, каб на мяне таксама паглядзелі... У мяне з чатырох дзяцей трое пенсіянераў. А яшчэ восем унукаў і столькі ж праўнукаў. Імёны ўсіх памятаю! — папярэджвае маё пытанне бабуля.

Пад уражаннем запытаў маіх «гідаў»: няўжо іх кліенты ўсе такія. Пачуў, што дзядуля ў такім жа ўзросце, як Перапечына, і за руль нярэдка садзіцца. Сваім прыкладам натхняе моладзь пазбавіцца ад дрэнных звычак...

На развітанне мне расказалі, што днямі адбудзецца прэзентацыя зборніка народных гульняў, аўтарамі якога з'яўляюцца члены «БАКС». Увогуле, у іх яшчэ шмат нестандартных ідэй, рэалізоўваць якія дапамажа жаданне быць здаровымі — целам і духам!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

## АД СЭРЦА

**Валанцёрскаму руху «Тэрыторыя дабра» ў Ваўкавыскім раёне ўжо шэсць гадоў. У ім удзельнічае больш за 250 старшакласнікаў. Не так даўно прайшоў сёмы раённы злёт валанцёрскіх атрадаў «Наша будучыня пачынаецца сёння...», пра які расказвае газета «Наш час».**

Вучні бяруць пад апеку дзяцей і пажылых людзей, займаюцца прыродаахоўнай і краязнаўчая работай, даглядаюць пахаванні воінаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Валанцёры з 19 школ раёна падзяліліся на злёце сваім досведам у рэалізацыі сацыяльна значных ініцыятыў і новымі ідэямі. Журы адзначала наватарства і практычныя вынікі праектаў. Падчас злёту прайшла дабрачынная акцыя «Дзеці — дзецям»: валанцёры школ і гімназій горада з падарункамі наведалі выхаванцаў дзіцячага дома.

## НА ЎЛАСНЫМ ПРЫКЛАДЗЕ

**Выязны раённы семінар-нарада прайшоў у Ваўкавіцкім сельсавеце Чавускага раёна. Якія пытанні разгледзела мясцовая ўлада, расказвае карэспандэнт раённай газеты «Іскра».**

Старшыня Ваўкавіцкага сельвыканкама Ларыса Пунінская расказала, што ў жыхароў скарачаецца колькасць буйной рагатай жывёлы. Прычына — насельніцтва старэе і трымаць тую ж карову становіцца цяжка. А маладыя не імкнуцца развіваць сваю гаспадарку. Аднак тым часам працягваецца закупка малака ў насельніцтва. Найбольш актыўныя ў гэтым пытанні жыхары вёсак Бахацец і Хацкавічы. У вёсцы Бахацец, дарэчы, падчас семінара ўзнагародзілі мясцовага актывіста Валерыя Сулімава. Ён на сваім падворку трымае кароў, свіней, коз, курэй і гусей. Падчас сустрэчы ў Хацкавічах жыхары паднялі праблему рамонту дарог населенага пункта. Ім адказалі, што ўчастак дарогі будзе прыведзены ў нармальны стан. Людзі таксама агучылі праблемы медыцынскага абслугоўвання і занятасці дзяцей.

## НЕПРЫКМЕТНЫЯ СЛУЖБЫ

**Хто працуе ў бальніцы? Першы адказ відомы — урачы. Але ёсць і іншыя супрацоўнікі, якія штодзень забяспечваюць жыццё пацыентаў. Карэспандэнт газеты «Прамень» Стаўбцоўскага раёна завітала на бальнічную кухню.**

Штодзень тут гатуецца больш за 200 абедаў для пацыентаў 11 стацыянарных аддзяленняў. Існуе дароспае і дзіцячае меню, асобна гатуюцца абеды для тых, каму прапісана дыета. Для радзільнага, акушэрскага, дзіцячага аддзяленняў, а таксама для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны — таксама асобнае меню, якое ўключае дадатковыя сняданак і падвячорак. У мінулым годзе быў праведзены капітальны рамонт харчблока: не толькі адрамантаваны сцены, падлога, столь, але і заменена абсталяванне, устаноўлены новыя харчаварачны кацёл, шафа для смажання, з'явіліся агароднінарэзка, бульбачыстка і іншыя сучасныя прылады для аблягчэння працы работнікаў сталовай. На кухні стала больш прасторна. Спаўна ўсё гэта можа ацаніць кухонная работніца Галіна Язвінская, якая 30 гадоў працуе на адным месцы. На яе думку, такі рамонт стварае добры настрой, стымулюе падтрымліваць інвентар і памяшканне ў бездакорным санітарным парадку.

## УПРЫГОЖВАЕМ ГАРАДЫ

**Новы арт-аб'ект з'явіўся ў Навагрудку. Графіці з выявай палаца ў Шчорсах упрыгожыла фасад будынка на вуліцы Савецкай. Яго з'яўленне прымеркавана да святкавання 220-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча, піша газета «Новае жыццё».**

Убачыць, як выглядаў палац у Шчорсах у XIX стагоддзі, жыхары змогуць дзякуючы гравюры Напалеона Орды. Менавіта яна легла ў аснову сюжэта графіці, створанага мастакамі з Мінска Яўгенам Салановічам і Яўгенам Драгіным. «Калі мы ўбачылі эскіз, адразу ўзнікла ідэя паўтарыць тэхніку гравюры, — тлумачаць мастакі. — Фактура сцяны сапраўды падобная на гравюру, што робіць малюнак падобным на арыгінал. Да таго ж карычневы колер найлепшым чынам перадае старажытнасць палаца і дапаўняе графіці гістарычнай тэматыкі, якія ўжо ёсць у горадзе». Нягледзячы на тое, што на стварэнне карціны спатрэбілася каля сямнаццаці гадзін, праца была цікавай. Спадзяёмся, што яна будзе доўга радаваць навагрудчан і стане яшчэ адным упрыгожаннем горада».

**Надзея АНІСОВІЧ.**

УСЁ Ў ПАРАДКУ

# І Якуба Коласа, і Луізу Бойд не сорамна было б запрасіць

## Пінкавіцкі сельсавет па выніках мінулага года стаў найлепшым у вобласці па пытаннях добраўпарадкавання



Так выглядае адна з вуліц у Пінкавічах.

**ПІНКАВІЧЫ знакамітыя найперш як коласаўская мясціна. Тут працаваў малады настаўнік Канстанцін Міцкевіч пасля вёскі Люсіна, што ў Ганцавіцкім раёне. За два гады работы будучага пісьменніка паспелі палюбіць мясцовыя жыхары, якім ён усяляк спрыяў. На месцы школы, дзе жыў і працаваў педагог, зараз знаходзіцца яго музей. У ім беражліва захоўваюцца расказы вартаўніка школы, цёплыя ўспаміны вучняў. А вуліцы, па якіх сто гадоў таму хадзіў будучы класік, сталі, вядома, зусім іншымі.**

### ДЭПУТАЦКІ КОРПУС

Асаблівасці гэтага сельсавета абумоўлены яго блізкасцю да горада. У дзвюх вёсках адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі пражывае амаль 5200 чалавек. Школа і дзіцячы садок тут самыя вялікія ў раёне. На тэрыторыі працуе да дзясятка невялікіх прадпрыемстваў і філіялаў даволі вядомых вытворцаў, такіх, напрыклад, як «Пінскдрэў», «Медтэхніка», «Белмедінструменты», ёсць свой участак ЖКГ.

Дэпутаты сельскага Савета ў сваёй большасці — гэта дырэктарскі корпус прадпрыемстваў і арганізацый, якія функцыянуюць у Пінкавічах. **Старшыня сельскага Савета Анжаліка ГУДКОВА** лічыць такі падыход найбольш прымальным у фарміраванні мясцовага Савета. Многія ўжо працуюць трэцяе скліканне, і ніякіх праблем не ўзнікае. «Яшчэ ніводзін з дэпутатаў не адмовіў у просьбе вырашыць нейкае канкрэтнае пытанне па добраўпарадкаванні, — кажа Анжаліка Паўлаўна. — А пытанні паўстаюць рэгулярна: то вялікую кветніцу ў скверы ўстанавіць, то зямлі для клумбы падвезці, нешта прыбраць. Заўсёды знаходзім разуменне».

### ВАДА І ГАЗ

— Раней адной з асноўных праблем добраўпарадкавання быў раён новай забудовы, — расказвае кіраўнік мясцовай улады. — Не варта забываць, мы жывём на балоце. У ваколіцах даўно пракладзены водаадводныя каналы. Праўда, за апошнія дзесяцігоддзі гэтыя каналы зараслі не толькі мялзняком — там падняліся дрэвы. Дык вось, калі нарэшце расліннасць выдалілі, каналы прачысцілі і прыбралі, нават памяняўся выгляд гэтай мясціны, якую мы называем «за чыгункай». Усё зроблена за сродкі раённага бюджэту. Менавіта там цяпер з'яўляюцца вуліцы, будуюць дамы навасёлы. Найперш у раёне забудовы праклалі новыя дарогі, каб людзі маглі завозіць будматэрыялы і весці работы. Затым у раён прыйшлі газ, вада, нават сеткі оптавалаконнай сувязі працягнулі.

Адначасова з развіццём раёна новай забудовы ішла пракладка водаправода ў старой частцы Пінкавічаў. Для гэтага арганізавалі шэсць кааператываў. Працэс ішоў цяжка. Людзі нават хадзілі на прыём да губернатара. Яны бачылі, што навасёлам дапамагае бюджэт, а сталыя жыхары нібыта абдзеленыя дапамогай. Але ж кансэнсус быў дасягнуты, і з дапамогай кааператываў ваду праклалі. Апошнюю нітку водаправода шостага па ліку кааператыва здалі летась. І зараз ужо ўсе Пінкавічы з гарадской вадой. А гэта, несумненна, азначае новы ўзровень якасці жыцця.

### ЦЯПЛІЦЫ І КВЕТКІ

Цікава, што ў вёсцы, дзе ўсе дамы ацяпляюцца газам, па-ранейшаму запатрабаваныя мясцовыя віды паліва. Тут купляюць нямала дроў і торфабрыкету. Гаворка аб тым, што тутэйшыя жыхары маюць шмат цяпліц. Аказваецца, памылка — лічыць, што захапленне агурочным бізнесам пайшло з Альшан. У Пінкавічах агуркамі сталі займацца яшчэ раней, праўда, у значна меншых маштабах. Але і цяпер тым, хто вырошчвае агуркі, памідоры, кветкі, на жыццё хапае. Апошнім часам папулярнасць тут набірае вырошчванне цюльпанаў і петуній. Ёсць яшчэ адна адметная рыса ў тутэйшых агароднікаў. Яны навучыліся арганічна ўпісваць свае цяпліцы ў агульны выгляд двароў — так, каб гэтыя самы выгляд не псаваць. І сельвыканкам іх усяляк да гэтага стымулюе. Кожны год да дня вёскі праводзіцца конкурс на самы лепшы падворак і гаспадары, якія вылучыліся, атрымліваюць граматы, падарункі.



Старшыня сельскага Савета Анжаліка ГУДКОВА побач з крыжам-абярэгам.

Кветак у вёсцы шмат. Іх тут любяць разводзіць. Цяпер імі ўпрыгожваюць многія мясціны. У час работы мінулага склікання на вуліцах з'явіліся вялікія кветніцы, набытыя спонсарамі. «Калі сталі высаджваць першыя расліны, некаторыя пазней пакралі, — уздыхае Анжаліка Паўлаўна. — Першы год дзенідзе па адной кветачцы заставалася. Падключалі старастаў, грамадскасць, тлумачылі, прасілі, ушчувалі. На другі год фактаў крадзяжоў стала менш, а цяпер людзі самі прыходзяць і прапаноўваць насенне, саджанцы кветак. Мы сёлета іх не куплялі, поўнасцю пасадзілі кветкі, якія ахвяравалі вяскоўцы». У гэтым годзе ўздоўж галоўных вуліц старшыня рызыкнула высадзіць туі. 300 штук маладзенькіх туй ужо сядзяць у радок з красавіка, пакуль ніводная не знікла са свайго месца. Людзі самі сочаць за парадкам, жыхары бліжніх дамоў прыглядваюць за саджанцамі.

### ВЫХАВАННЕ ПРЫКЛАДАМ

— У нас ёсць свой участак ЖКГ, з навядзеннем парадку дапамагаюць прадпрыемствы, але, калі не будзе разумення і падтрымкі людзей, сапраўднага парадку не даб'ешся, — разважае Анжаліка Гудкова, педагог па прафесіі. — Вялікае значэнне мае выхаванне, асабісты прыклад, грамадская думка. Многае робіць у гэтым кірунку старасты. Я сама ў машыне маю пакет для смецця і рабочыя пальчаткі. Калі еду недзе па тэрыторыі і бачу пластыкавую бутэльку ці іншыя адходы, абавязкова прыбіраю. Асабліва крыўдна, калі ведаеш: толькі што ўсё прыбралі камунальнікі, але ж знайшоўся нехта, хто насмеціў. Як з гэтым змагацца? Прыбіраць. І дзяцей так выхоўваем у садку.

У дзіцячым садку не так даўно правялі капітальны рамонт. Будынак дашкольнай установы быў узведзены яшчэ ў савецкія часы і выгляд меў даволі гаротны. Раённы бюджэт выдзеліў грошы, зрабілі добры рамонт, мадэрнізавалі харчовы блок, абнавілі летнія веранды. Утульны двор, які патанае ў кветках, і малыя, і дарослыя гаспадары ўстановы з задавальненнем паказваюць гасцям.

Яшчэ на радасць пінкавіцкай дзятве летась адкрылі новую дзіцячую пляцоўку. З леташніх паляпшэнняў можна назваць і абсталяванне гандлёвых месцаў каля прадуктовай крамы. Раней гаспадары, якія хацелі прадаць сваю прадукцыю, прыносілі скрынкі альбо зэдлікі і сядзелі побач з крамай. Цяпер тут паставілі сталы з лаўкамі і месца для гандлю стала цывілізаваным. Людзі ўдзячныя, цяпер кожны дзень там гандлюе нехта з мясцовых жыхароў.

### ЗНАКАВЫЯ АБ'ЕКТЫ

Амаль уся вёска сабралася, калі адкрывалі знакавы аб'ект для населенага пункта: у цэнтры вёскі на скрыжаванні дарог з'явіўся вялікі крыж-абярэг з паліраванай нержавейкі на гранітным пастаменце. Яго пабудаваў мясцовы бізнесмен Міхаіл Нарывончык. Цяпер у вёсцы кажуць, што такога крыжа па ўсёй краіне больш не знойдзеш. Мабыць, так і ёсць. Карэнныя жыхары Пінкавічаў ганарацца сваёй мясцінай. Гэта заўважыла яшчэ ў далёкія 30-я гады амерыканская падарожніца і даследчыца Луіза Арнер Бойд. Яна і расказала свету пра Пінскае Палессе і вёску Пінкавічы. Фотаздымкі жыхароў вёскі ўвайшлі ў многія альбомы даследчыцы. Іх выстаўкі з поспехам прайшлі ў Амерыцы. Пра пінчукоў уплывовая амерыканка гаварыла заўсёды з сімпатыяй. Больш чым праз 80 гадоў пасля яе экспедыцыі ў Пінкавічах з'явіўся памятны знак у гонар Луізы Бойд. Камень-валун з адпаведным надпісам усталявалі на тэрыторыі літаратурна-краязнаўчага музея Якуба Коласа. І народны пісьменнік, і заакіянская падарожніца пакінулі апісанні самабытнасці краю, прыгожай прыроды, добразычлівых людзей. А сённяшнія жыхары вёскі, здаецца, не падвялі. Прынамсі, па выніках мінулага года абласны Савет і аблвыканкам назвалі Пінкавіцкі сельсавет найлепшым у вобласці. Ганаровы дыплом уручыў старшыня аблвыканкама Анатоль Ліс на цырымоніі ўшанавання пераможцаў спаборніцтва «Чалавек года».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Пінскі раён.*


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Могилевоблавтотранс»**

Лот № 1. **Капитальное строение с инв. № 700/С-55906 – административное здание** площадью 712,4 кв. м, расположено по адресу: г. Могилев, ш. Гомельское, 5. Здание расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000007005525 (право аренды), площадью – 0,1256 га.

***Начальная цена продажи: 131 731,97 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 13 173,20 бел. руб.***

Лот № 2. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-93968 – помещение №1 не относящееся к жилищному фонду** площадью – 230,4 кв. м, расположено по адресу: г. Могилев, ш. Гомельское, 5.

***Начальная цена продажи: 40 988,54 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 4 098,85 бел. руб.***

Лот № 3. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-93985 – производственное помещение № 2** площадью – 845,1 кв. м, расположено по адресу: г. Могилев, ш. Гомельское, 5.

***Начальная цена продажи: 103 063,68 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 10 306,37 бел. руб.***

Лот № 4. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-93987 – помещение многофункциональное № 4** площадью – 510,5 кв. м, расположено по адресу: г. Могилев, ш. Гомельское, 5.

***Начальная цена продажи: 47 622,53 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка 4 762,25 бел. руб***

Лоты №№ 2–4 расположены на земельном участке с кадастровым номером 740100000007005021 (право постоянного пользования, доля в праве – 3/4) площадью – 0,3092 га. Отдельные земельные участки для обслуживания каждого изолированного помещения не выделены

Лот № 5. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-112484 – административное помещение** площадью – 142,2 кв. м, расположено по адресу: г. Могилев, ш. Гомельское, 5/1-2. Здание расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000007004955 (право постоянного пользования, доля в праве – 997/1000), площадью – 5,6354 га. Отдельный земельный участок для обслуживания изолированного помещения не выделен.

***Начальная цена продажи: 29 616,00 белорусских рублей с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 2 961,60 бел. руб.***

| | |
|---|---|
| **Продавец** | ОАО «Могилевоблавтотранс», УНП 700167884, г. Могилев, ш. Гомельское, 1 |
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 19 июля 2018 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 18 июля 2018 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение 5 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона с победителем заключается договор купли-продажи. Оплата производится в соответствии с подписанным договором купли-продажи |

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); представившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юридические лица Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации, копии учредительных документов, копию документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; – индивидуальные предприниматели Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации и документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц и индивидуальных предпринимателей – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранные индивидуальные предприниматели – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представители иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованную в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, в соответствии со счет-фактурой, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8 0222) 72-41-14, 8 029 624-26-25, 8 044 738-18-99**

# НЯЛЁГКАЯ ПА́РА

## Бочкі, душавыя кабіны, прыватныя лазні... Якія паслугі будуць запатрабаваны на вёсцы ў будучыні?

**ВІДАВОЧНА, што сельскага насельніцтва становіцца менш, многія вёскі пусцеюць, лазні з-за страт закрываюцца, а многія працуюць раз на месяц ці наогул па заяўках вяскоўцаў. Разам з тым праблема па забеспячэнні населеных пунктаў лазнямі застаецца і яе трэба вырашаць.**

Ваўкавыскі раён — адзін з тых, дзе знаходзіцца найбольшая колькасць лазняў. Факт сам па сабе станоўчы, але многія з іх не працуюць. З 23 аб'ектаў дзейных толькі 14. Падтрымліваецца іх санітарны стан, летась у большасці праведзены рамонт.

Па словах **намесніка старшыні Ваўкавыскага райвыканкама Таццяны АНДРУШКЕВІЧ,** скаргаў з боку насельніцтва ў мінулым годзе не паступала. Тут стараюцца арганізаваць падвоз людзей у найбліжэйшыя аграгарадкі.

Аднак нявырашаныя праблемы ў гэтай справе ёсць. У асноўным яны звязаны з утрыманнем лазняў іх уласнікамі, а гэта сельгаспрадпрыемствы і ЖКГ. З-за недахопу сродкаў і эканамічнай немэтазгоднасці з абароту выведзена дзевяць аб'ектаў. Многія знаходзяцца ў дрэнным стане, не працуе абсталяванне, а запланаваны рамонт так і не праведзены. Напрыклад, лазня ў вёсцы Тупічаны ў наступным годзе пойдзе пад знос. Зараз жыхароў возяць у суседні аграгарадок Воўпа. Некаторыя будынкі выкарыстаюць пад склад ці прададуць з аўкцыёну.

> У шэрагу раёнаў перайшлі на заяўляльны прынцып работы — у сельсавет падаюцца заяўкі ад вяскоўцаў, згодна з якімі і працуе лазня.

— Сацыяльны стандарт па колькасці памывачных месцаў у нас выконваецца, — заўважыла Таццяна Андрушкевіч, — некаторыя ўласнікі аказваюць паслугі для жыхароў вёсак бясплатна. У цэлым кошт наведвання для вяскоўцаў таннейшы, чым у райцэнтры. Калі ў Ваўкавыску ён складае 5 рублёў, то ў аграгарадках — 4.

Так, лазні не пустуюць, але ўсе яны стратныя. Зараз мясцовыя ўлады заклапочаны тым, каб падтрымліваць належны санітарны стан будынкаў і знайсці гаспадароў пустуючым аб'ектам. У раёне думаюць аб тым, каб арганізаваць перасоўную лазню.

Дарэчы, да гэтага ўжо наблізіліся ў Шчучынскім раёне. Як расказаў **начальнік аддзела ЖКГ райвыканкама Андрэй ШКІНДАРАЎ,** праз месяц гэты праект павінен запрацаваць.

Лазня на колах нагадвае бочку, але ў Шчучыне вырашылі зрабіць перасоўную



лазню ў форме куба. Модульны варыянт менш стратны, бо не трэба трымаць штат, плаціць падаткі на нерухомасць; ніжэйшыя выдаткі на ваду і электраэнергію. У населеныя пункты лазня будзе выязджаць па графіку.

> **А яшчэ тут спрабуюць прыцягнуць да лазневай справы прыватніка. І ён ужо знайшоўся. Прадпрымальнік бярэ ў арэнду лазню ў вёсцы Руткевічы і будзе працягваць гэты кірунак дзейнасці. Як паведамілі ў райвыканкаме, зараз вядзецца афармленне дакументаў.**

— Будынак у добрым стане, і ахвотных як след папарыцца нямала, — канстатуе Андрэй Шкіндараў, — гэты рытуал па-ранейшаму папулярны, да таго ж карысны для здароўя.

На праблему лазняў звярнулі ўвагу абласныя ўлады. Сітуацыя сапраўды прымушае задумацца. У вобласці 343 лазні, з якіх 163 — не працуюць. Прычыны розныя.

Разам з адсутнасцю рамонту назіраецца і нізкае наведванне лазняў. Напрыклад, у Мастоўскім раёне налічваецца 42 такія аб'екты, з іх працуе толькі 14. Аналагічная сітуацыя і ў іншых раёнах. Па словах **намесніка начальніка ўпраўлення ЖКГ Гродзенскага аблвыканкама Алены КАСПЯРОВІЧ,** на месцах праблема выкарыстання былых лазняў амаль не вырашаецца. Напрыклад, у Слонімскім раёне не працуе палова лазняў і амаль усе яны не падлягаюць аднаўленню. Аб'екты належаць сельгаспрадпрыемствам. У Лідскім раёне працуе трэцяя частка лазневага фонду. Такая ж сітуацыя і ў іншых раёнах.

Гаворка на гэту тэму нядаўна вялася ў Гродне падчас калегіі дзяржкантролю. Адзначалася, што матэрыяльна-тэхнічная база большасці лазняў састарэла, паўсотні правераных аб'ектаў утрымліваюцца ў нездавальняючым стане. Па словах **начальніка ўпраўлення КДК Гродзенскай вобласці Наталлі ЖУР,** плата за «памыўку» для вяскоўцаў высокая, што таксама ўплывае на наведванне. У гэтым выпадку многія пенсіянеры на вёсках аддаюць перавагу дзедаўскаму спосабу мыцця ў хатніх умовах — балейках ды тазіках.

Ды і графік работы многіх лазняў нездавальняючы. Напрыклад, у Смаргонскім раёне ўсе вясковыя лазні працуюць толькі раз на месяц, у іншых — два разы. У шэрагу раёнаў перайшлі на заяўляльны прынцып работы — у сельсавет падаюцца заяўкі ад вяскоўцаў, згодна з якімі і працуе лазня. Такі рэжым звязаны з эканоміяй энергарэсурсаў і кантролем іншых выдаткаў на ўтрыманне аб'ектаў. Скарачэнне іх колькасці сапраўды дазволіла зменшыць страты. Калі ў 2016 годзе яны склалі 2,3 млн рублёў, то летась — 1,9 млн. За першы квартал гэтага года — 500 тысяч.

> **Але закрыццё лазняў — гэта не выйсце. Вяскоўцам трэба прапанаваць альтэрнатыву, падкрэслілі ў Дзяржкантролі.**

Часткова гэта работа вядзецца. Раёнамі ўносяцца прапановы, якія датычацца лазневай гаспадаркі. Гэта і передача аб'ектаў прыватніку, і зніжэнне кошту, і здача ў арэнду, і пашырэнне паслуг, і дастаўка жыхароў з вёсак, і аптымізацыя страт. Мяркуецца правесці апытанне насельніцтва, якое пражывае ў жыллёвым фондзе без выгод, — трэба высвятліць, каму рэальна патрэбны паслугі. Таксама будзе зроблены аналіз усіх зваротаў на гэту тэму.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

А НЕ ШКОДЗЬ!

## ПІЛЬШЧЫКА ЗНІШЧЫЛІ З ПАВЕТРА

**Авіятары Міністэрства па надзвычайных сітуацыях правялі апрацоўку лесу ў нацыянальным парку «Нарачанскі».**

Па выніках даследавання, праведзенага «Беллесахованай», на яго тэрыторыі быў выяўлены ачаг рыжага хваёвага пільшчыка — колькасць шкодніка тут істотна перавышала дапушчальныя значэнні.

Найбольш эфектыўным метадам барацьбы з насякомымі было праведзенне ахоўных авіяапрацовак. Улічваючы сціслыя тэрміны па правядзенні мерапрыемстваў, кіраўніцтва парку звярнулася па дапамогу ў дзяржаўную авіяцыйную аварыйна-выратавальную ўстанову «Авіяцыя».

У нацыянальным парку працаваў самалёт Ан-2 са спецыяльнай апаратурай для апырсквання насаджэнняў. За тыдзень экіпаж авіятараў МНС апрацаваў 6231 гектар пашкоджаных угоддзяў, а агульны налёт склаў больш за 40 гадзін.

## ПАД СЯКЕРУ — ПАЎТАРА ВАГОНА

### Столькі дзелавой драўніны незаконна нарыхтавалі ва Уздзенскім лясгасе

**На тэрыторыі Слабадскога доследна-вытворчага лясніцтва Уздзенскага лясгаса супрацоўнікі ўпраўлення аператыўнага рэагавання Дзяржінспекцыі выявілі незаконную высечку. Пад выглядам дазволенай прыборкі захламленасці (высечкі сухіх і паваленых ветрам дрэў) вальшчыкі нарыхтоўвалі здаровыя сырарослыя хвоі і елкі — дзелавую драўніну.**

Паслугі па правядзенні высечкі-прыборкі захламленасці на тэрыторыі каля 40 гектараў лясгаса павінен быў аказаць індывідуальны прадпрымальнік са Слуцка. Ён, у сваю чаргу, наняў для гэтых работ мясцовага ІП з Узды, а той — дваіх вальшчыкаў. Апошнія трое прызнаны вінаватымі ў правядзенні незаконнай высечкі. Разам з сухімі дрэвамі ўсяго за тыдзень нядбайныя лесарубы спілавалі 144 здаровыя дрэвы, не прызначаныя для высечкі, аб'ёмам каля 73 кубаметраў. Гэтай драўнінай можна было б загрузіць паўтара чыгуначных вагона.

Нанесеная незаконнай высечкай шкода склала 11,6 тысячы рублёў, яна ўжо пакрыта парушальнікамі. Акрамя таго, ім будзе прызначаны яшчэ і штраф: вальшчыкам — у памеры да 30 базавых велічынь, індывідуальнаму прадпрымальніку — ад 10 да 150 базавых велічынь.

Уздзенскі прадпрымальнік раней ужо прыцягваўся да адказнасці за незаконную высечку пры падобных абставінах. Восенню мінулага года ў тым жа лясніцтве ён нарыхтаваў удвая больш драўніны, чым было дазволена па дакументах. За гэта суд канфіскаваў у яго трактар і бензапілу.

Наяўнасць сістэматычных парушэнняў гаворыць аб недастатковым кантролі за высечкамі з боку супрацоўнікаў лясгаса, падкрэслілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. За апошнія два тыдні дзяржінспектары выявілі 55 парушэнняў правілаў лесакарыстання, сярод якіх — транспарціроўка драўніны па неадпаведных рэчаісных дакументах, незаконныя высечкі і факты крадзяжу драўніны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 14 чэрвеня 2018 года.**